КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №27 (155)
◂ 24 ЛІПЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**Найджэл Гулд-Дэвіс: «ГЛЯДЗЕЦЬ НАПЕРАД, А НЕ НАЗАД!»**

Стар. 4–5

**ЯКІ НАЦЫЯНАЛІЗМ НАМ ПАТРЭБНЫ**

Культурным нацыяналізмам, такім папулярным сярод апазіцыі, пералік магчымых нацыянальных праектаў не вычэрпваецца

Стар. 6

**АПОШНІЯ З МАГІКАН**

Еўрапейскі левы тэрарызм памёр. У Германіі склала зброю адна з апошніх экстрэмісцкіх груповак

Стар. 12

**ГЕРАІНЯ ГЕТА**

Акторка і спявачка Ганна Хітрык

Стар. 15

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**У сувязі з адпачынкам наступны нумар газеты выйдзе 14 жніўня**

▸ ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

# НА РОСТАНЯХ



Фота Уладзя Грыдзіна

Вольга ХВОІН

**Пяты з'езд беларусаў свету «Бацькаўшчына» прайшоў пад знакам кампрамісу. Удзел у ім прынялі 252 дэлегаты з 18 краінаў свету. Мерапрыемства наведалі дзяржаўныя чыноўнікі, што нетыпова для выбудаванай сістэмы адасаблення «апазіцыя — улада». Кіраўніцтва «Бацькаўшчыны» дыпламатычна вытрымала дыстанцыю, праявіўшы сябе гаспадаром з'езда.**

Кампраміснасць праявілася ад пачатку: замест гімна «Магутны Божа», які традыцыйна падкрэслівае недзяржаўнасць падобных мерапрыемстваў, зайграла мелодыя з «Полацкага сшытку». Дзяржаўныя чыноўнікі ўзялі слова толькі пасля таго, як прагучаў аўдыёзапіс звароту старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы ды выступіў з прывітальным словам амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан.

Міністр культуры Павел Латушка і ўпаўнаважаны па справах рэлігіяў і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка (апошні прысутнічаў на з'ездзе ўсе два дні «ад званка да званка») выступілі з прывітальнымі словамі, якія, праўда, нагадвалі доўгія справаздачы пра дасягненні на ніве апякунства над беларушчынай. Усе акцэнты расставіў цяпер ужо былы старшыня «Бацькаўшчыны» Алесь Марачкін, пакпіўшы, што яго прамова на фоне папярэдніх выступаў не такая аптымістычная. Напрыканцы Марачкін прапанаваў вярнуць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай — ініцыятыву сустрэлі воплескамі.

Цягам двух дзён размовы вяліся вакол праблем з захаваннем нацыянальнай гісторыі, культуры, мовы. Сярод цэлага шэрагу рэзалюцый і прапаноў, з нашага пункту гледжання, найбольш вартая ўвагі ініцыятыва ўнясення зменаў у праект закона «Аб беларусах замежжа», якая прадугледжвае ўвядзенне пасведчання беларуса замежжа па аналогіі з «картай паляка». Гэты дакумент мусіць дапамагаць этнічным беларусам пры наведванні імі гістарычнай радзімы, у прыватнасці, атрымліваць шматразовую беларускую візу на палёгкавых умовах, не рэгістравацца па прыбыцці ў Беларусь, мець доступ да адукацыі і медыцынскай дапамогі нароўні з грамадзянамі Беларусі ды іншае.

Таксама былі прынятыя звароты да розных дзяржаўных органаў аб стварэнні ўстаноў па справах беларускай дыяспары, ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў, падтрымцы беларускамоўных СМІ, тэле- і радыёпраграм па-за межамі Беларусі, зварот аб беларускай мове, захаванні і падтрымцы Беларускай хаты — культурна-асветніцкага цэнтра Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».

На знак таго, што «Бацькаўшчына» — не праўладная арганізацыя, хоць і са скрыпам, але была прынятая рэзалюцыя, у якой асуджаюцца арышты ўдзельнікаў акцыяў салідарнасці з палітвязнямі і сем'ямі зніклых без вестак апанентаў цяперашняй улады.

Напрыканцы другога дня працы з'езд абраў новыя кіраўнічыя органы, у тым ліку і старшыню. Ёю фактычна аднагалосна (толькі два чалавекі ўстрымаліся) была абраная Алена Макоўская, якая дагэтуль займала пасаду намесніцы старшыні. Алена Макоўская заявіла, што для яе такая салідарнасць была нечаканай, але вельмі прыемнай. «Для мяне заяўлена вельмі высокая планка, бо маімі папярэднікамі на гэтай пасадзе былі людзі нязломныя, вельмі прынцыповыя, сапраўдныя патрыёты Бацькаўшчыны — Васіль Быкаў, Радзім Гарэцкі, Аляксей Марачкін. Я буду імкнуцца трымаць гэту планку», — падкрэсліла новая кіраўніца «Бацькаўшчыны».

Вакол з'езда «Бацькаўшчыны» ад самага пачатку было мноства спрэчак і пытанняў наконт адносін з уладамі. Арганізатары доўга не маглі атрымаць дазвол на арэнду памяшкання. Справа зрушылася з мёртвай кропкі пасля ўмяшання галоўнага рэдактара «*Советской Белоруссии*» Паўла Якубовіча. Пагаворваюць, што не апошнюю ролю ў гэтым адыграла і адмова падтрымаць ініцыятыву Аляксандра Казуліна па стварэнню арганізацыі «Беларускі дом», адным з заснавальнікаў якога мусіла выступіць «Бацькаўшчына».

Дарэчы, на з'ездзе гэта пытанне не ўздымалася. Экс-старшыня арганізацыі Алесь Марачкін заявіў, што з ратацыяй кіраўнічых кадраў нічога істотна не зменіцца, аднак новаму кіраўніцтву варта падрыхтавацца для ўладаў «пугу». «Новыя кіраўнікі — менеджэры высокага класа, якія могуць арганізаваць дыялог з уладамі. Аднак у гэтай сітуацыі, акрамя «салодкага перніка», павінна быць падрыхтаваная «пуга», — лічыць Алесь Марачкін. — Улады б задаволіла кіраваная грамадская арганізацыя. Яны будуць рабіць усё, каб не было ні кроку направа, ні кроку налева. Я непакоюся, што арганізацыя можа стаць кіраванай. Магчыма, што разам з інтарэсамі арганізацыі свае інтарэсы будуць прасоўваць улады. Прэс-канферэнцыя з чыноўнікамі падчас з'езда беларусаў свету — гэта знак. Знак дыялогу. Але пры гэтым, дыялогу не па роўных. Таму што наперадзе прэзідэнцкія выбары, а ў нашу раду ўваходзяць палітычна заангажаваныя людзі. Адны выступаюць за дыялог з уладамі, а іншыя адстойваюць маральна-этычныя прынцыпы і патрабуюць рэальных, а не дэкаратыўных пераменаў у краіне».

Расійскі «*Коммерсант*» змясціў істэрычны артыкул пра з'езд беларусаў свету, у якім ці не адназначна гаворыцца пра разварот апазіцыйна настроенай арганізацыі ў бок Лукашэнкі, і, адпаведна, маўклівую згоду ўладаў на барацьбу з наступствамі русіфікацыі Беларусі. Па вялікаму рахунку, нічога крамольнага ў прысутнасці на з'ездзе дзяржаўных чыноўнікаў няма — жыццё не стаіць на месцы і аднойчы беларусы, якія знаходзяцца па розныя бакі барыкад, будуць вымушаныя пайсці насустрач адзін аднаму. Натуральна, калі да апазіцыі прыходзяць прадстаўнікі дзяржавы, то са сваім інтарэсам. Але вырашаць узровень дыялогу і ўзаемадзеяння ўсё ж мусіць кіраўніцтва «Бацькаўшчыны», найперш зважаючы на інтарэсы сваіх сябраў і, як слушна заўважыў Марачкін, маральна-этычныя прынцыпы.

Што тычыцца новай кіраўніцы арганізацыі — Алены Макоўскай, то, хаця яна і саступае ранейшым старшыням у грамадскім аўтарытэце, але на дадзеным этапе мае неблагую падтрымку, імпэт і, як мінімум, задэклараваны намер трымацца маральнай планкі сваіх папярэднікаў.

Працяг тэмы на стар. 14 ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ЛІДА. ПАДАРУНАК АД ПІСЬМЕННІКАЎ

Неўзабаве Лідскаму гістарычна-мастацкаму музею будзе перададзена калекцыя палотнаў мастакоў, што знаходзілася ў былым Доме літаратараў і належалі ліквідаванаму Саюзу беларускіх пісьменнікаў. Сюды будуць перавезены карціны, якія ўпрыгожвалі сцены дома адпачынку творцаў «Іслач».

Раней на Лідчыне знайшла прытулак бібліятэка гэтага грамадскага аб'яднання.

### БАРАНАВІЧЫ. ЧЫГУНКА АДСВЯТКУЕ

Баранавіцкае аддзяленне Беларускай чыгункі сваё прафесійнае свята, якое прыпадае на 2 жніўня, вырашыла адзначыць шыкоўна. Чыгуначнікі і гараджане з гэтай нагоды будуць гуляць тры дні.

Мерапрыемствы распачнуцца 31 ліпеня. Культурная праграма разнастайная: адкрыццё выставы, прысвечанай 65-й гадавіне вызвалення Беларусі пад назвай «Успамінаў імгненне жывое», святочнае пасяджэнне чыноўнікаў, прадстаўнікоў адміністрацыі чыгункі, ветэранаў працы і грамадскасці. Пасля ў горадзе адбудуцца канцэрты, спартыўныя мерапрыемствы.

### АСТРАВЕЦ. СУПРАЦІЎ НАРАСТАЕ

Нягледзячы на ўціск, колькасць актывістаў, якія змагаюцца супраць пабудовы АЭС, узрастае. Ігар Пастухоў, дырэктар ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры», што знаходзяцца ў 5 кіламетрах ад пляцоўкі будаўніцтва АЭС, звярнуўся ў Саўмін і Міністэрства энергетыкі з просьбай не будаваць АЭС каля ахоўваемых прыродных тэрыторый. Раней у абарону экалагічна чыстай тэрыторыі Беларусі выступілі навукоўцы, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі інтэлігенцыі і дэмакратычнай супольнасці.

### ГЛЫБОКАЕ. ДЗЕЦІ СТВАРАЮЦЬ МУЛЬТФІЛЬМ

Юныя мастакі з Глыбокага і іх аднагодкі з латвійскага горада Лудзы сумесна ствараюць анімацыйны фільм. З кожнага боку ў праекце ўдзельнічае па 10 дзяцей. Мультфільм будзе распавядаць пра фальклорныя традыцыі беларускага і латышскага народаў. Перад пачаткам супольнай працы будучыя мультыплікатары некалькі месяцаў вывучалі нацыянальныя традыцыі і звычаі сваіх суседзяў. Затым яны прыдумалі сцэнар. Ён прысвечаны падарожжу Несцеркі, але поўны сюжэт не раскрываецца. Зараз творчая супольная праца ідзе на Глыбоччыне ў вёсцы Івесі. У жніўні ў Лудзах удзельнікі праекта працягнуць працу ўжо ў студыйных умовах з дапамогай сучасных кампутарных праграм. У наступным годзе на міжнародным кінафестывалі «Магніфікат» запланаваны паказ гэтага фільма ў намінацыі «Анімацыйнае кіно».

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

▶ ЖЫЦЦЁ

## ПРЫБЫТКІ СКАРОЦЯЦЦА

**Па дадзеных агенцтва ПРАЙМ-ТАСС, валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў у студзені–чэрвені 2009 года склала, па папярэдніх дадзеных, 10832 мільярды долараў, што на 41,9 працэнта менш, чым у аналагічным перыядзе 2008 года.**



Пагаршэнне эканамічнага стану прадпрыемстваў выклікае значнае скарачэнне бюджэтных паступленняў, якое немінуча ўцягне Беларусь у новую стадыю крызісу — сацыяльную.

«Па ўсіх эканамічных законах Беларусь зараз пачынае ўцягвацца ў бюджэтны крызіс. Відавочна, што эканамічны стан нашых найбуйнейшых прадпрыемстваў, якія даюць асноўныя паступленні ў бюджэт, працягвае пагаршацца. Гэта прыкладна 200 экспартаарыентаваных вытворчасцяў. Яны ўжо не даюць столькі грошай у бюджэт, як летась. Гэта значыць, што прыбыткі людзей, якія атрымліваюць заробкі з дзяржаўнай казны, зараз немінуча будуць скарачацца. Працэс гэты пачнецца ў другой палове гэтага года і працягнецца ў пачатку наступнага», — пракаментаваў сітуацыю эканаміст Міхаіл Залескі.

Пры гэтым дзеля атрымання чарговага траншу крэдыту МВФ ураду давядзецца пайсці на выкананне рэкамендацый фонду, адной з якіх з'яўляецца лібералізацыя коштаўтварэння.

«І ў нас адбудзецца тое, што адбылося ва ўсіх краінах, дзе працуе МВФ і Сусветны банк, — рэзкае сацыяльнае расслаенне насельніцтва. Улады цалкам могуць дапусціць такі сцэнар развіцця падзей. Дзеля захавання сваіх мяккіх фатэляў і магчымасці працягваць сваю авантурыстычную палітыку, яны могуць пайсці на ўсё, што заўгодна», — лічыць Залескі.

**Паводле «Хартыі'97»**

▶ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## МАЗЫРСКАЯ СПРАВА

**21 ліпеня ў дачыненні да мазырскага праваабаронцы Паўла Наздры ў мясцовым ваенкамаце быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні па артыкуле 25.8 КоАП.**

Як паведаміў Павел, яму як ваеннаабавязанаму інкрымінуюць парушэнне правілаў вайсковага ўліку, што цягне накладанне штрафу ад дзвюх да трох базавых велічынь. Пратакол склаў намеснік начальніка Мазырскага ваенкамата падпалкоўнік Юрый Пракапенка.

«Мяне абвінавачваюць у несвоечасовым паведамленні пра змену месца працы, хоць аддзел кадраў прадпрыемства, дзе я працую, своечасова праінфармаваў пра гэта ваенкамат», — сказаў праваабаронца.

Пасля суда ён мае намер абскардзіць дзеянні ваенкамата, бо лічыць прыцягненне яго да адміністрацыйнай адказнасці «палітычна матываваным і звязаным з праваабарончай дзейнасцю». Прычыну такога пераследу ён бачыць у тым, што ў ліпені гэтага года звярнуў увагу ўладаў «на грубыя парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь па адлове, адстрэле, утрыманні і эўтаназіі безнаглядных жывёл, якія маюць месца ў горадзе Мазыры і Мазырскім раёне». Па заяве Наздры пракуратура Гомельскай вобласці правяла праверку гэтых фактаў і вынесла прадпісанне кіраўніцтву Мазырскага раёна пра іх устараненне.

«Апошняй кропляй, што перапоўніла чашу цярпення мясцовых чыноўнікаў, стаў мой зварот да старшыні Мазырскага райвыканкама Анатоля Ліса 20 ліпеня з прапановай пабудаваць прытулак для бяздомных жывёл і адмовіцца ад практыкі іх знішчэння», — сказаў Наздра.

Паводле яго слоў, за апошнія два гады гэта трэці выпадак, калі ўлады выкарыстоўваюць артыкул 25.8 КоАП для прыцягнення яго да адміністрацыйнай адказнасці за праваабарончую дзейнасць.

**БелаПАН**

▶ СПРАВА

## ПРЫМІРЭННЯ НЕ БУДЗЕ

**Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі Яўген Какуша адхіліў прапанову сустаршыні аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Аляксея Шэіна спыніць справу ў Вярхоўным судзе прымірэннем бакоў. Пра гэта паведамляе прэс-служба аргкамітэта БХД.**

20 ліпеня ў Вярхоўным судзе пачаўся разгляд скаргі аргкамітэта па стварэнні БХД на рашэнне Міністэрства юстыцыі, якое адмовіла ў рэгістрацыі партыі.

Падчас пасяджэння ў аўторак Шэін агучыў пазіцыю аргкамітэта па стварэнні БХД: «Мы паказваем сябрам-заснавальнікам нашай партыі, што мы гатовы адстойваць пазіцыю больш чым тысячы чалавек, якія выказаліся за неабходнасць стварэння БХД. Афіцыйнай уладзе мы даем магчымасць прадэманстраваць сваю добрую волю і прыняць такое рашэнне, якое б адпавядала закону».

У прапанову БХД уваходзіла карэкціроўка спіса заснавальнікаў партыі з улікам тых асоб, якія адклікалі свае подпісы пад ціскам уладаў; удакладненне некаторых звестак пра сябраў партыі, да якіх Мінюст агучыў прэтэнзіі; паўторная аплата дзяржаўнай пошліны.

З боку Мінюста пагадненне бакоў прадугледжвала скасаванне свайго ранейшага рашэння пра адмову ў дзяржаўнай рэгістрацыі БХД.

Прадстаўнік Мінюста Яўген Какуша мяркуе, што «рашэнне Міністэрствам юстыцыі прынята. Іншае рашэнне прынята быць не можа».

Нагадаем, устаноўчы з'езд БХД прайшоў у Мінску 28 лютага 2009 года. 16 красавіка Мінюст адмовіў БХД у рэгістрацыі. Асноўныя прэтэнзіі заключаліся ў тым, што пры апытанні прадстаўнікамі міністэрства заснавальнікаў партыі праз тэлефанаванні і паштовыя лісты не ўсе яны правільна назвалі колькасць удзельнікаў; колькасць вылучаных дэлегатаў. 17 красавіка Мінюст прыпыніў сваё папярэдняе рашэнне пра непрызнанне БХД з фармулёўкай «паводле шматлікіх зваротаў заснавальнікаў». 12 мая Мінюст другі раз адмовіў у дзяржаўнай рэгістрацыі партыі «БХД». У рашэнні адзначалася, што спіс заснавальнікаў і пратакол устаноўчага з'езда БХД утрымліваюць несапраўдныя звесткі. 10 чэрвеня арганізатары БХД накіравалі скаргу ў Вярхоўны суд. Аргкамітэт па стварэнні БХД лічыць, што падставы для адмовы ў рэгістрацыі партыі з'яўляюцца незаконнымі.

▶ ПЕРСПЕКТЫВЫ

## ПРЫВАТЫЗАЦЫЙНАЯ ГАТОЎНАСЦЬ

Алена ЗАПАЛЯНСКАЯ

**20 ліпеня Дзяржаўны камітэт па маёмасці і прыватызацыі распаўсюдзіў інфармацыю, што са спісу прадпрыемстваў, якія будуць прададзеныя, па тэхнічных прычынах выключаныя 35 аб'ектаў, але дадзеныя тры. Усяго за гэтыя два гады дзяржава плануе прадаць 176 прадпрыемстваў.**

Тэрмін прыватызацыі пяці прадпрыемстваў перанесены на наступны год. Сярод іх — Наваполацкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства па транспарту нафты «Дружба» і РУП «Гомельтранснафта Дружба».

Міжнародны валютны фонд, у сваю чаргу, прагназуе, што калі Беларусь не атрымае чарговы транш крэдыту ў 500 мільёнаў долараў, то магчымыя праблемы ў эканоміцы. Фонд рэкамендуе звярнуць увагу на прыватызацыю дзяржаўнай маёмасці. Дарэчы, з удзелам МВФ плануецца ўтварыць у Беларусі Агенцтва па прыватызацыі.

Прыватызацыйная гісторыі Беларусі не такая ўжо і працяглая. Дзяржава прадае прадпрыемствы дастаткова неахвотна. Прэтэндэнтамі ж часта з'яўляюцца прадстаўнікі расійскага бізнесу. Так, найбуйнейшая здзелка была звязана з продажам «Газпраму» ў 2007 годзе «Белтрансгаза», які ў Беларусі адказвае за транспарціроўку нафты і газа. Труба каштавала расіянам 2,5 мільярда долараў. Перадача акцыяў ідзе штогод па 12,5 працэнта і завершыцца ў 2010 годзе.

Перспектывы ў прыватызацыі ў Беларусі ёсць. Звязаныя яны не толькі з патрэбай інвестыцыяў у краіну, але і з тым, што павялічваецца знешняя запазычанасць краіны. Незалежныя эканамісты ўжо даўно разглядаюць продаж маёмасці як магчымы варыянт расплаты за крэдыты.

Палітолаг Валерый Карбалевіч лічыць: «Прыватызацыя — праблема шматбаковая. А многія эксперты разглядаюць яе аднабакова. Перад усім, беларускі рэжым ставіцца да гэтага пытання з пункту гледжання ўтрымання ўлады. Нельга разглядаць праблему выключна з пункту гледжання эканамічнай мэтазгоднасці — у Беларусі яна не дзейнічае. Адсутнасць прыватызацыі да гэтага часу — адзін з важных элементаў трываласці рэжыму. Лукашэнка баіцца парушыць адну з асноваў, на якой базуецца ягоная ўлада. Ён будзе рабіць асцярожныя крокі ў гэтым накірунку толькі калі выгада ад прыватызацыі пераважыць магчымую рызыку».

Па меркаванні Карбалевіча, можа быць дзве прычыны для прыватызацыі: дамовы з МВФ для атрымання новай часткі крэдыту і дзень, калі вельмі спатрэбяцца грошы, а не будзе адкуль іх узяць. Што тычыцца дамовы з МВФ, у ёй ёсць фармальныя моманты, якія можна лёгка выканаць. Напрыклад, акцыянаваць і выставіць на продаж прадпрыемствы, але паставіць 25 умоваў, якія адштурхнуць любога інвестара.

«Акрамя таго, трэба быць вельмі асцярожнымі, бо кошты на прадпрыемствы ва ўмовах крызісу вельмі знізіліся. Таму прыватызацыя ў Беларусі, калі і будзе, то кропкавая і з умовай, што ўлады атрымаюць больш, чым прайграюць», — лічыць палітолаг.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗНОЎ ПАЧЫНАЮЦЦА ВОЙНЫ...

Сяргей САЛАЎЁЎ



Photo.ByMedia.Net

**Не дарма эканаміст Яраслаў Раманчук прадказваў, што так званыя «гандлёвыя войны» паміж Расіяй і Беларуссю будуць развівацца. Як у ваду глядзеў. За малаком і сельскагаспадарчай тэхнікай надышла чарга мяса.**

Расійскі сельгаснагляд 21 ліпеня ўвёў часовыя абмежаванні на пастаўку ў Расію прадукцыі ААТ «Гомельскі мясакамбінат» і ААТ «Брэсцкі мясакамбінат».

Як паведамляецца на афіцыйным сайце ведамства, забарона ўведзена «ў сувязі з выяўленнем пры маніторынгавых даследаваннях забароненых і шкодных рэчываў у жывёлагадоўчай прадукцыі беларускіх мясакамбінатаў».

У гэтай сітуацыі трэба адзначыць звышаператыўную рэакцыю беларускіх кантралюючых органаў. Ужо 22 ліпеня Галоўнае ўпраўленне ветэрынарыі Мінсельгасхарчу прыпыніла пастаўкі ў Расію прадукцыі трох айчынных прадпрыемстваў — Лунінецкага малаказавода, Бабруйскага мясакамбіната і Клецкага маслакамбіната. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў прэсслужбе Мінсельгасхарчу. Паводле слоў прэс-сакратара міністэрства Дар'і Казлоўскай, экспарт прадукцыі на расійскі рынак часова спынены з-за выяўлення ў ёй недапушчальнай колькасці рэшткавых антыбіётыкаў.

Найбліжэйшым часам спецыялісты ветэрынарнай службы Беларусі правядуць расследаванне па факце выяўлення шкодных рэчываў у прадукцыі названых прадпрыемстваў, на іх вытворчасцях будзе арганізаваны пастаянны ўзмоцнены маніторынг.

Акрамя таго, галоўнае ўпраўленне ветэрынарыі Мінсельгасхарчу Беларусі ўзмацняе кантроль за прадукцыяй Гомельскага і Брэсцкага мясакамбінатаў, пастаўкі якой у Расію былі часова прыпыненыя Рассельгаснаглядам у сувязі з паўторным выяўленнем у прадукцыі антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы.

Здаецца, гэты адказ адэкватны для расійскага боку. Але нездарма большасць спецыялістаў лічыць такія «гандлёвыя войны» выключна палітычнымі. Бо адначасова з забаронай на ўвоз беларускага мяса ў Расію беларускі бок заявіў пра забарону эксплуатацыі беларускага ўчастка нафтаправоду «Унеча — Вентспілс», што належыць расійскаму прадпрыемству «Захадтранснафтапрадукт». Як паведаміў прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных справах Віталь Навіцкі, гэта зроблена выключна з прычыны яго нездавальняючага тэхнічнага стану.

Беларусь пачала вучыцца ў Расіі. Выключна «тэхнічнымі» прычынамі тлумачыў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Расіі Генадзь Анішчанка забарону на экспарт беларускага малака ў Расію. Нібыта, нашы прадпрыемствы не аформілі новыя сертыфікаты. Зараз такія ж «тэхнічныя» пытанні ўзніклі і ў Беларусі.

Цікава, ці адпавядае беларускім дзяржстандартам праца вайсковых аб'ектаў у Беларусі, кшталту станцый забеспячэння сувязі з марскімі сіламі Расіі ў Вілейцы? Гэта станцыя была пабудавана яшчэ за савецкім часам. Можа, яе праверыць на тэхнічную і экалагічную бяспечнасць? Вось атрымалі б козыры ў гульне з Расіяй!

А тым часам у Беларусі хапае і сваіх праблем. Каму спадабаецца тое, што за звычайнай гумкай ці за бутэлькай мінералкі трэба выстойваць чаргу ў гіпермаркеце? Здаецца, нікому. Але гарадскія ўлады Мінска лічаць па-іншаму.

Адраджэнне сеткі прыпыначных кіёскаў у Мінску не мае ніякіх перспектыў. Пра гэта заявіла начальнік упраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ларыса Камарова на прэсканферэнцыі 22 ліпеня.

Паводле яе слоў, да прыняцця рашэння аб ліквідацыі кіёскаў на прыпынках у сталіцы пытанне прапрацоўвалася не толькі на ўзроўні Мінгарвыканкама, але і Міністэрства замежных спраў: быў прааналізаваны досвед краін Еўропы. У выніку ў сталіцы было вырашана рэалізоўваць на прыпынках «мінімальную колькасць дробнаапотовых тавараў, друкаваных выданняў і канцылярскіх тавараў». Гэтым займаюцца кіёскі «Белсаюздрука», 80 працэнтаў прадукцыі якіх складаюць друкаваныя выданні.

Нагадаем, Мінгарвыканкам прыняў рашэнне пра знос кіёскаў яшчэ ў 2006 годзе. У канцы 2007 года чыноўнікі вярнуліся ды гэтага пытання, і да канца 2008 года ўсе прыпыначныя кіёскі ў Мінску былі дэмантаваны. Прадстаўнікі гарвыканкама сцвярджалі, што кіёскі як форма дробнарознічнага гандлю на прыпынках «сябе зжыла».

Не ведаю, вопыт якіх «краін Еўропы» быў прааналізаваны. На вуліцах Бонна і Берліна можна набыць шырокі асартымент тавараў, і нават не ў кіёсках. Наўпрост на вуліцы, на грыле там смажацца каўбаскі, прадаецца піва, стаяць аўтаматы па продажы тых жа цыгарэт і прэзерватываў. У Празе таксама ніякіх праблемаў з камерцыйнымі шапікамі не назіралася. І нават Юрый Лужкоў, мэр Масквы, на аналагічную мінскай прапанову аб зносе такіх жа кіёскаў у Маскве загадаў «не чапаць прадпрымальнікаў», асабліва ў крызісны час.

Больш за тое, нашы чыноўнікі, здаецца, вырашылі, што забаронай можна вырашыць любое пытанне. Міністэрства гандлю прапануе забараніць вытворчасць і продаж на тэрыторыі Беларусі слабаалкагольных напояў. Адпаведную прапанову міністэрства накіравала ва ўрад, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску 21 ліпеня першы намеснік міністра гандлю Міхаіл Свяніцкі.

«Мы рашуча выступаем супраць вытворчасці і рэалізацыі слабаалкагольных напояў, такіх як джын-тонік», — заявіў намеснік міністра. Ён адзначыў, што Мінгандлю сур'ёзна непакоіцца сітуацыяй са спажываннем гэтых напояў на фоне алкагалізацыі насельніцтва. Паводле слоў Свяніцкага, за спажываннем слабаалкагольных напояў няма належнага кантролю, бо яны «выпадаюць з-пад дзеяння закона аб рэгуляванні абароту алкагольнай прадукцыі».

Нагадаем, што Міністэрства ўнутраных спраў таксама выступае за забарону, — забарону распіцця піва на вуліцах. І таксама такі праект накіраваны на разгляд Палаты прадстаўнікоў.

Канешне, барацьба з алкагалізмам актуальная для Беларусі. Але гэта не робіцца забаронай. Вынікам «сухога закону» ў Амерыцы напачатку мінулага стагоддзя стала тое, што там узніклі мафіёзныя кланы. Вынікам «сухога закону» пры Гарбачове ў СССР стала развіццё самагонаварэння і масавыя атручванні алкагольнымі сурагатамі. Няўжо складана зразумець, што алкагалізацыя насельніцтва, — не з-за слабаалкагольных напояў, а з-за «шмурдзякоў», «чарніла», і іншых так званых «пладова-ягадных вінаў».

Калі і далей нашы чыноўнікі будуць дзейнічаць выключна па прынцыпу «забараніць і не пушчаць», нічога з гэтага не атрымаецца. Як у глабальным, так і ў лакальным плане.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

### АРЦЁМ ДУБСКІ

Актывіст зарэгістраванай у Чэхіі арганізацыі «Малады фронт» Арцём Дубскі, якога 7 ліпеня Асіповіцкі суд пакараў годам зняволення, абвясціў галадоўку пратэсту ў Бабруйскім следчым ізалятары. Падставай для галадоўкі стала стаўленне адміністрацыі калоніі: Арцём захварэў, аднак дактары адмовіліся даваць яму лекі. У красавіку мінулага года Арцём Дубскі быў пакараны двума гадамі абмежавання волі («хатняя хімія») па «справе 14-ці» за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Сёлета 3 сакавіка была распачатая чарговая крымінальная справа за парушэнне правілаў адбыцця пакарання: хлопец з'ехаў без дазволу ўчастковага інспектара ва Украіну. Арцём нядаўна галадаў на знак салідарнасці з вязнямі-прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам, Юрыем Лявонавым, Уладзімірам Асіпенкам.

### АЛЯКСАНДР ГЛЕБ



Паўабаронца «Барселоны» і гулец зборнай Беларусі Аляксандр Глеб пераходзіць у міланскі футбольны клуб «Інтэр» (чэмпіён Італіі сезону 2008/2009). «Барселона» пагадзілася выплаціць міланскаму «Інтэру» 40 мільёнаў еўра і аддаць форварда Самуэля Это'О і паўабаронцу Аляксандра Глеба за форварда міланскай каманды і зборнай Швецыі Златана Ібрагімавіча. Глеб будзе гуляць у «Інтэры» на правах гадавой арэнды. Праз год «Інтэр» атрымае прыярытэтнае права на выкуп Глеба. Для Глеба «Інтэр» стане чацвёртым еўрапейскім клубам. Да гэтага ён гуляў за нямецкі «Штутгарт», лонданскі «Арсенал» і «Барселону». Дарэчы, у апошнім клубе ён так і не стаў гульцом асноўнага складу. Яшчэ ў маі Аляксандр Глеб выказваў незадаволенасць рашэннем трэнера «Барселоны» не ўключаць яго нават у склад запасных для ўдзелу ў сёлетнім фінале Лігі чэмпіёнаў. Тады ж футбаліст заявіў, што думае пра змену клуба і што надышоў час нешта мяняць. Сёлета ў серыі «А» італьянскага чэмпіянату будуць гуляць тры беларусы: Міхаіл Сівакоў за «Кальяры», Віталь Кутузаў за «Бары», Аляксандр Глеб за «Інтэр». Усе гэтыя футбалісты ў свой час гулялі за барысаўскі футбольны клуб «БАТЭ», які летась выйшаў у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў.

### МІКАЛАЙ АНДРЫЯНАЎ



Захапленне паляваннем каштавала пасады генеральнаму дырэктару Беларускага металургічнага завода Мікалаю Андрыянаву. Напрыканцы чэрвеня Аляксандр Лукашэнка выступіў з заявай, што «ў поле зроку КДБ трапіў начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Жлобінскага РАУС Міненкоў, які арганізоўваў умовы для заняткаў паляваннем, рыбалкай і яшчэ тым-сім. У 2003 годзе ён набыў і аформіў на падстаўную асобу сядзібу на тэрыторыі Жлобінскага раёна, захапіўшы пры гэтым больш за гектар лясных угоддзяў, самавольна ўзвёў 14 пабудоў, абзавёўся зграяй з 29 парадзістых сабак і трыма дзікамі. Усю гэтую гаспадарку абслугоўвалі мясцовыя жыхары. На гэтай базе рэгулярна арганізоўваліся паляванне, рыбалка з удзелам кіраўніцтва, у тым ліку Беларускага металургічнага завода і высокапастаўленых службовых асоб органаў унутраных спраў, напрыклад, начальніка ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Ермакова».

Андрыянаў да гэтага быў на добрым рахунку ў кіраўніцтва дзяржавы, прадпрыемства знаходзілася ў ліку найбольш паспяховых, а ў сакавіку Андрыянаву было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны металург Рэспублікі Беларусь». Пасля звальнення Мікалая Андрыянава з'явілася інфармацыя, што падставай для гэтага стала не толькі яго захапленне паляваннем, але і пагаршэнне эканамічных паказчыкаў завода.

З 10 ліпеня афіцыйна выканаўцай абавязкаў генеральнага дырэктара БМЗ стаў Анатоль Савёнак, які на працягу некалькіх гадоў з'яўляўся намеснікам гендырэктара.

▸ АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

# Найджэл Гулд-Дэвіс: «ГЛЯДЗЕЦЬ

**З амбасадарам Вялікабрытаніі ў Беларусі Найджэлам Гулд-Дэвісам размаўляе шэф-рэдактар «Новага часу» Аляксей Кароль.**



***— Спадар амбасадар, працэс змены палітыкі самаізаляцыі Беларусі на дыялог з Захадам супаў па часе з глабальным эканамічным крызісам. Паводле ацэнак незалежных экспертаў, прырода і прычыны крызісу ў Беларусі іншыя, унутраныя. Афіцыйны ж Мінск сцвярджае, што крызіс у Беларусь прыўнесены звонку. Еўрасаюз робіць узгодненыя захады для пераадолення крызісу. Якая пазіцыя Вялікабрытаніі па гэтых праблемах? На Ваш погляд, якія магчымасці ў пераадоленні крызісу адкрываюцца для Беларусі ў рамках дыялогу?***

— Глабальны крызіс — гэта наш агульны выклік. Ён закрануў усе без выключэння краіны, у тым ліку Вялікабрытанію і Беларусь. Як падкрэсліла «Вялікая дваццатка» ў Лондане ў красавіку гэтага года, для ўсіх краін свету крытычна важна заставацца адкрытымі адна адной у сферы гандлю і інвестыцый. Мы ведаем, што палітыка пратэкцыянізму падчас рэцэсіі 30-х гадоў мінулага стагоддзя прывяла да таго, што яна перарасла ў Вялікую Дэпрэсію.

Міжнародныя інстытуты, у якіх ЕС адыгрывае ключавую ролю, ужо прадэманстравалі сваю гатоўнасць аказаць дапамогу Беларусі ў гэты складаны час. МВФ зарэзерваваў для Беларусі крэдыт у тры з паловай мільярда долараў. Варта адзначыць, што МВФ цяпер, падчас крызісу, з'яўляецца самым буйным знешнім крэдыторам Беларусі. Сусветны Банк, ЕБРР і непасрэдна ЕС таксама актыўна разглядаюць магчымасць аказання далейшай фінансавай дапамогі.

Што да прычынаў крызісу, то мы ведаем: у першую чаргу гэты глабальны крызіс быў выкліканы працяглым перыядам залішняй ліквіднасці і неадэкватнага кіравання рызыкамі. Але, як мне здаецца, незалежна ад далейшага развіцця крызісу ў доўгатэрміновай перспектыве Беларусь павінна будзе пайсці па шляху рынкавай эканомікі — найбольш эфектыўнай формы арганізацыі эканомікі. Безумоўна, гэты працэс павінен ісці з асцярогай, аднак яго, тым не менш, неабходна праводзіць.

***— У сваёй прамове на прыёме з нагоды Дня нараджэння Каралевы Вы адзначылі вялікі прагрэс у развіцці адносін з Беларуссю. І падкрэслілі, што «будзе зроблена яшчэ больш для шчыльных адносін паміж намі». А што менавіта, не маглі б канкрэтызаваць? Гэта асабліва цікава, калі ўлічваць тую акалічнасць, што Англія — гэта значыць Ваша амбасада — будзе прадстаўляць Іспанію ў якасці старшыні ЕС у Беларусі.***

— У мінулым годзе ў адносінах ЕС і Беларусі быў дасягнуты прарыў. З абодвух бакоў былі разбураныя стэрэатыпы. Але мы спадзяемся, што гэта толькі пачатак. У нас ёсць патэнцыял для далейшага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ва ўсіх галінах, асабліва ў гандлі і інвестыцыях. Цяпер Беларусь мяжуе з трыма дзяржавамі, якія ўваходзяць у ЕС. Я разумею, што зараз Беларусь не імкнецца да сяброўства ў ЕС, і гэта, вядома ж, з'яўляецца яе суверэнным выбарам. Але нават калі не ставіць на мэце сяброўства ў ЕС, у нас ёсць велізарная колькасць магчымасцяў для супрацоўніцтва. ЕС імкнецца да больш шчыльных узаемаадносінаў і адкрыта кажа пра тое, што для гэтага Беларусь павінна прадэманстраваць прагрэс у пэўных сферах і не рабіць крокаў у зваротным накірунку. Такім чынам, Беларусь сама вызначае, якім будзе далейшае развіццё нашых адносін.

***— Эканамічная мадэль Беларусі састарэла, не адпавядае агульнапрынятым сусветным крытэрам. Значэнне нашай краіны як транзітнай тэрыторыі, калі будуць пабудаваныя новыя газаправоды ў абыход Расіі, той жа «Nabucco», можа рэзка зменшыцца. Што, на Ваш погляд, трэба зрабіць Беларусі, каб не апынуцца на ўзбочыне еўрапейскай цывілізацыі?***

— На мой погляд, будаўніцтва «Nabucco» наўрад ці моцна паўплывае на Беларусь, бо той газ, які, як мяркуецца, будзе праз яго праходзіць, і раней не транспартаваўся праз тэрыторыю Беларусі. Значна большы ўплыў на пазіцыю Беларусі як краіны-транзіцёра можа аказаць будаўніцтва газаправода Nord Stream.

Для большай інтэграцыі ў сусветныя эканамічныя працэсы Беларусі варта не столькі клапаціцца пра аднаўленне ранейшага статусу «зборачнага цэха» СССР, колькі выкарыстаць новыя першакласныя магчымасці, якія з'явіліся ўжо ў постсавецкі перыяд. Трэба глядзець наперад, а не назад. У першую чаргу, гаворка ідзе пра выключны інтэлектуальны патэнцыял, які ўжо выкарыстоўваецца міжнароднымі кампаніямі (у галіне аўтсорсінгу распрацоўкі праграмнага забеспячэння), і які ўжо дае Беларусі канкурэнтную перавагу ў сусветнай эканоміцы.

***— Ці няма небяспекі, што эканамічная і фінансавая дапамога Захаду нашай краіне можа быць выкарыстана, насуперак разлікам ЕС, не на карысць лібералізацыі, а для кансервацыі палітычнага і эканамічнага статус-кво ў Беларусі?***

— Міжнародныя фінансавыя інстытуты, якія цяпер аказваюць фінансавую дапамогу Беларусі (такія, як МВФ), маюць ужо ўзгодненыя праграмы, накіраваныя на падтрыманне ўстойлівага развіцця той або іншай краіны. Гэтыя праграмы не з'яўляюцца чымсьці адмыслова распрацаваным для Беларусі, у такіх праграмах удзельнічаюць усе краіны — партнёры МВФ. Беларусь таксама прыняла на сябе абавязкі рэалізаваць комплекс мер, накіраваных на лібералізацыю эканомікі.

***— Якая пазіцыя Вялікабрытаніі ў дачыненні да санкцый па Беларусі, што цяпер прыпыненыя? Ці будуць яны адмененыя канчаткова або не выключана іх аднаўленне?***

— Я не хацеў бы рабіць прагнозы, мне лягчэй казаць пра тое, якая сітуацыя зараз. Рашэнне пра адмену або аднаўленне санкцый будзе прымацца, зыходзячы з той сітуацыі, якая складзецца да часу разгляду гэтага пытання. На працягу мінулага года ЕС прадэманстраваў сваю гатоўнасць наладзіць нармальныя ўзаемаадносіны з Беларуссю. Але ўсё будзе залежаць ад тых крокаў, якія зробіць беларускае кіраўніцтва.

***— У якіх сферах Вялікабрытанія бачыць свой інтарэс і свой удзел у супрацоўніцтве з Беларуссю? Якія кампаніі, у якой ступені і ў якіх галінах эканомікі ўжо выявілі такую зацікаўленасць?***

— Большую частку таваразвароту паміж Вялікабрытаніяй і Беларуссю складаюць прадукты перапрацоўкі нафты. У нас таксама наладзіліся актыўныя фінансавыя ўзаемаадносіны. Беларусь цалкам справядліва і абгрунтавана абрала Лондан — вядучы міжнародны фінансавы цэнтр — месцам правядзення свайго першага Інвестыцыйнага форума ў лістападзе мінулага года. Аднак гэта быў толькі першы крок — патэнцыял супрацоўніцтва значна большы. Наогул, і брытанскія, і іншыя кампаніі гатовыя інвеставаць туды, дзе існуюць устойлівыя, празрыстыя і прадказальныя ўмовы вядзення бізнесу. Беларусь ужо зрабіла некалькі важных крокаў для таго, каб палепшыць бізнес-клімат у краіне. Я ўзрадаваны, што ёсць намеры зрабіць яшчэ больш.

***— Цікавасць Вялікабрытаніі да Беларусі, яе палітыка ў дачыненні да нашай краіны нейкім чынам абумоўліваюцца яе стасункамі з Расіяй?***

— Гэта дзве незалежныя палітыкі. Мы не разглядаем іх у непарыўнай узаемасувязі. Некаторыя мясцовыя аналітыкі, напэўна, маюць на ўвазе гэту ўзаемасувязь і лічаць, што ЕС праводзіць нешта накшталт палітыкі сфер уплыву навыперадкі з Расіяй. Гэта састарэлы погляд на становішча рэчаў, уласцівы больш XIX стагоддзю, а не XXI. Мы толькі вітаем, калі Беларусь будзе падтрымліваць добрыя ўзаемаадносіны як з ЕС, так і з Расіяй. Для нас гэтыя два накірункі не з'яўляюцца ўзаемавыключальнымі, гэта не «гульня з нулявой сумай».

***— Існуе гістарычны стэрэатып пра вельмі шчыльную ўзаемаабумоўленасць знешнепалітычных курсаў Вялікабрытаніі і ЗША. Як у рэальнасці ажыццяўляецца ўзгадненне гэтых курсаў у дачыненні да краін ЕС, а таксама да Беларусі?***

— Беларусь — не адзіная краіна, якая праводзіць шматвектарную палітыку. Брытанія падтрымлівае цесныя партнёрскія адносіны з ЗША, ЕС і краінамі Садружнасці (якія раней уваходзілі ў Брытанскую імперыю). Мы разглядаем усе гэтыя ўзаемаадносіны ў адзіным рэчышчы знешняй палітыкі, паміж імі няма супярэчнасці.

Істотных адрозненняў паміж курсамі Вялікабрытаніі і ЗША ў дачыненні да Беларусі няма. ЕС і ЗША прытрымліваюцца адных і тых жа мэтаў і разам працуюць для іх дасягнення. Нягледзячы на шэраг нюансаў, якія ўзнікаюць з прычыны геаграфічных і гістарычных асаблівасцяў — што натуральна, — іх значэнне неістотнае ў параўнанні з нашымі агульнымі інтарэсамі і мэтамі.

***— Вядома, што наконт шэрагу аспектаў еўрадыялога з Беларуссю ёсць супярэчнасці па лініі «рэальная палітыка — дэмакратычныя каштоўнасці». Якая пазіцыя Вялікабрытаніі? Чаму аддаецца прыярытэт — прагматызму або каштоўнасцям?***

— Я не пагаджуся з такім сцвярджэннем. Хачу зноў падкрэсліць, што ў аснове знешняй палітыкі ЕС не ляжыць ніякай геапалітычнай канцэпцыі, асабліва калі гаворка ідзе пра саму Еўропу. ЕС — палітычная сіла, якая дзейнічае ў адпаведнасці з канцэпцыямі XXI стагоддзя. У XXI стагоддзі міжнародныя адносіны ў той жа ступені ажыццяўляюцца паміж людзьмі, як і паміж урадамі. Гэтыя адносіны больш абапіраюцца на каштоўнасці, чым на сілу. Бяспека, у прыватнасці, разглядаецца як гульня з дадатнай сумай, якая дасягаецца праз перакананне і супрацоўніцтва, а не праз суперніцтва і пагрозы. Вядома ж, у свеце яшчэ ёсць месцы, дзе да гэтага часу дамінуюць састарэлыя, больш традыцыйныя падыходы, дзе спрабуюць дасягнуць бяспекі праз пагрозы, і нам трэба быць гатовымі адказаць на гэта адпаведным чынам. Але ў самой Еўропе такія падыходы засталіся ў мінулым.

У прыватнасці, з гэтага вынікае, што было б памылкай думаць, нібыта ЕС разыграе нейкую геапалітычную гульню з Беларуссю ў абыход тых прынцыпаў і каштоўнасцяў, якія з'яўляюцца для ЕС вызначальнымі. Такога не здарыцца.

***— Якімі павінны быць суадносіны паміж патрабаваннямі выканання 12 (або хаця б 5) умоў, папярэдне сфармуляваных ЕС, і магчымай эканамічнай падтрымкай краінамі ЕС?***

— Мы не гаворым пра ўмовы, мы кажам пра прапановы. Хацелася б яшчэ раз падкрэсліць — мы не пагражаем і не аказваем ціск. Мы прапаноўваем магчымасць больш поўных і больш прадуктыўных узаемаадносін і ўказваем на тое, што — паводле нашага меркавання — павінна быць зроблена для дасягнення гэтага.

***— Якая пазіцыя амбасады ў дачыненні да справы Мікалая Аўтуховіча і яго калегаў, а таксама наконт новага — ужо відавочна палітычна матываванага — прысуду Арцёму Дубскаму?***

— Усе краіны ЕС, у тым ліку і Вялікабрытанія, з трывогай сочаць за справай Арцёма Дубскага. ЕС зрабіў на гэты конт заяву ў Вене. Наступны этап — вынікі разгляду касацыйнай скаргі, якую збіраецца падаць адвакат Арцёма Дубскага. Будзе вельмі шкада, калі гэта стане каменем спатыкнення ва ўзаемаадносінах Беларусі і ЕС пасля ўсіх тых высілкаў, якія былі здзейснены на працягу мінулага года для таго, каб палепшыць гэтыя ўзаемастасункі. Нічые інтарэсы ад гэтага не выйграюць.

ЕС таксама занепакоены справай Аўтуховіча. Мы спадзяемся, што судовы разгляд гэтай справы пачнецца ў самы бліжэйшы час.

# НАПЕРАД, А НЕ НАЗАД!»

***— У сваёй прамове на прыёме з нагоды Дня нараджэння каралевы ў шэрагу важных рэчаў, зробленых Вялікабрытаніяй для збліжэння краін ЕС з Беларуссю, Вы адзначылі праграму «Усходняга партнёрства». У чым канкрэтна, на Ваш погляд, гэта значэнне?***

— Акрамя вызначанай гарантаванай грашовай сумы, прадугледжанай праграмай, больш значным момантам уяўляецца той факт, што Беларусь упершыню ўвайшла ў агульнаеўрапейскі праект. Гэтым абумоўліваецца яго значэнне ў доўгатэрміновай перспектыве. Яно нашмат большае, чым можа падацца на першы погляд. Банкіры, прадпрымальнікі з розных краін, шматлікія міжнародныя арганізацыі ўжо разумеюць, што адбылося. Гэта вельмі ўдалыя рамкі для развіцця адносін Беларусі са знешнім светам. Праграма адкрывае шлях да інвестыцый.

***— Вось ужо два гады Вы кіруеце дыпламатычнай місіяй Вялікабрытаніі ў Беларусі. Якія праекты за гэты час былі здзейснены, рэалізацыі якіх спрыяла амбасада?***

— Мы правялі шэраг мерапрыемстваў, сустрэч і вечарын, якія знаёмілі з брытанскімі традыцыямі. Сярод іх, напрыклад, вечарыны, прысвечаныя Уэльсу, Уінстану Чэрчылю, святкаванне Хэлоўіна.

Падзеяй быў і адборачны матч Кубка свету паміж Беларуссю і Англіяй, на які прыехала больш за тры тысячы нашых заўзятараў. Падчас гэтага матчу мы арганізавалі дзіцячы турнір для так званых інтэграваных каманд, у дадзеным выпадку для дзяцей з парушэннямі слыху. Я сам судзіў фінальныя гульні.

У нас ёсць адмысловая праграма, у адпаведнасці з якой штогод два прадстаўніка Беларусі атрымліваюць магчымасць навучацца ў Англіі ў магістратуры па праблемах міжнародных адносін. Праграма працуе ўжо шэсць гадоў.

***— Ёсць ужо выпускнікі? Яны вярнуліся дадому або ўладкаваліся ў Англіі?***

— Ёсць, каля 15 чалавек. Большасць вярнулася. Некаторыя пасля заканчэння навучання папрацуюць у Англіі, а потым, калі набяруцца досведу, вяртаюцца. У чэрвені мінулага года мы арганізавалі мастацкі конкурс для дзяцей па тэме ўзаемастасункаў паміж Вялікабрытаніяй і Беларуссю. У холе амбасады вы можаце ўбачыць карціну, якая атрымала гран-пры. Мы ўвесь час дапамагаем фондам, якія працуюць тут па аказанні дапамогі дзецям з чарнобыльскіх рэгіёнаў. Больш за тры тысячы дзяцей з вашай краіны штогод прыязджаюць да нас на аздараўленне. Гэтыя паездкі нясуць шмат добрага і для дзяцей, і для брытанскіх сем'яў, якія з вялікай радасцю іх прымаюць.

***— З аздараўленнем, напэўна, паўсталі складанасці ў сувязі з шэрагам абмежаванняў, уведзеных беларускімі ўладамі пасля гісторыі з Вікай Мароз?***

— Так, у мінулым годзе. Мы вельмі шмат працавалі над гэтым пытаннем і знайшлі рашэнне. У канцы мая гэтага года была дасягнута дамоўленасць і заключана пагадненне, якое дазволіць аднавіць аздараўленчыя паездкі ў Англію дзецям з чарнобыльскіх рэгіёнаў.

***— У той жа колькасці? Праграма не скарацілася?***

— Уведзеныя абмежаванні па ўзросту. Зараз могуць выязджаць толькі дзеці не старэй за 13 гадоў — з 7 да 13 гадоў. Але мы працягваем актыўныя дыскусіі з прадстаўнікамі ўлады і спадзяемся на паспяховае рашэнне гэтай праблемы.

***— Якія культурныя праграмы плануе пасольства на час Вашага знаходжання на пасадзе амбасадара?***

— На жаль, мне засталося працаваць у Беларусі ўсяго тыдняў шэсць-сем. Гэта балючае для мяне пытанне. Калі мне прапанавалі быць амбасадарам у Беларусі, я сказаў сваім калегам у Лондане, што хацеў бы абмежавацца двума гадамі. Па той прычыне, што я да таго часу ўжо 4 гады прапрацаваў у Маскве. Стаміўся ўдалечыні ад дому, засумаваў па хаце, па роднай краіне. Але цяпер я вельмі шкадую пра тое рашэнне. Аднак змяніць яго не магу. І ўжо прызначаны пераемнік. Мяне чакае новая цікавая праца.

***— Блог дыпламата ў інтэрнэце — з'ява сама па сабе рэдкая. У Беларусі ж Вы наогул адзіны дыпламат, які вядзе ўласны блог. Што ён для Вас — форма пашырэння прафесійных магчымасцяў, запатрабаванне душы ў новых нефармальных кантактах або рыса характару сучаснага чалавека, які без інтэрнэту жыць не можа?***

— Без інтэрнэту, на самай справе, жыць можна, але лепш жыць з інтэрнэтам. І тое, і другое, і трэцяе. На мой погляд, для дыпламата вельмі важна весці дыялог не толькі на прафесійным афіцыйным узроўні, але з шырокім колам людзей, грамадскасцю. У розных формах. Актыўныя ж карыстальнікі інтэрнэту — гэта самы дынамічны пласт грамадства. Блог важны для мяне не столькі магчымасцю выказаць сваё меркаванне, колькі тым, што ён дазваляе пачуць думкі іншых па розных пытаннях. Я з задавальненнем чытаю адказы. І вельмі багата з іх атрымліваю, таму што шмат разумных і дасведчаных людзей адгукаюцца на мае нататкі. Прычым, падкрэслю, водгукі гэтыя вельмі карэктныя. Прыстойнасць, дабрыня, ветлівасць, як мне здаецца, — адметныя рысы ў цэлым беларусаў, не толькі ў інтэрнэце.

Гэтыя рысы мне вельмі імпануюць. І я гэтага не забуду, хоць хутка і з'язджаю з Беларусі.

***— На сваім блогу Вы досыць часта звярталіся да пытанняў гісторыі. У тым ліку закраналі сталінскія рэпрэсіі, калі адштурхоўваліся ў сваіх развагах ад кніг Салжаніцына і Шаламава, — тэму, якая ў нас на афіцыйным узроўні зноў выцесненая ў зону забыцця. Што, на Ваш погляд, дае веданне гісторыі для разумення сучасных працэсаў? Якім чынам тэма таталітарызму, сталінізму ўплывае цяпер на грамадскую свядомасць, на стан розумаў?***

— Я тут толькі два гады. І не адважуся меркаваць пра канкрэтны ўплыў урокаў гісторыі ў Беларусі. Але калі гаворка ідзе пра тое, як ставіцца да гісторыі наогул, як вывучаць гісторыю ў любой краіне, то, на мой погляд, яе даследаванне і разуменне мае выключна важнае значэнне. Аб'ектыўнасць жа ўзнікае тады, калі людзі з рознымі меркаваннямі, абапіраючыся на разнастайныя і ўсім даступныя крыніцы, маюць магчымасць свабодна абмяркоўваць і спрачацца наконт самых розных тэмаў. Не варта баяцца крытыкі мінулага, дыскусій, дзе закранаюцца нават самыя балючыя моманты. Гэта, на мой погляд, не толькі не шкодна, але нават карысна.

Мае веды пра Беларусь, мае стасункі з людзьмі адкрылі перада мной трагічную ісціну: тут знойдзецца няшмат сем'яў, якіх бы не закранулі рэпрэсіі, напрыклад, 1930-х гадоў. Праз сваю сямейную гісторыю ўсе гэтыя людзі ведаюць, што адбывалася тады.

У Вялікабрытаніі праводзяцца вельмі вострыя дэбаты па праблемах гісторыі, нават нядаўняй. Напрыклад, наконт таго, як мы кіравалі нашымі былымі калоніямі. Выдадзена шмат кніг. У адных — крытыка за жорсткія метады кіравання. Другія ж кнігі, якія абапіраюцца на іншыя крыніцы і інтэрпрэтацыю падзей, апраўдваюць гэта. Такім чынам, адбываецца нармальная, здаровая гістарычная дыскусія.

***— З якімі ўражаннямі Вы пакідаеце нашу краіну?***

— З нашмат лепшымі, чым чакаў. Гэта агульная рыса для ўсіх маіх суайчыннікаў, якія ўпершыню наведваюць вашу краіну. Дзівіць дабрыня і прыстойнасць людзей у Беларусі, ветлівасць у адносінах паміж сабой і з замежнікамі, дзіўная мяккасць, у самім добрым сэнсе гэтага слова, імкненне развіваць сябе, паляпшаць сябе. Я гэта адчуваю шчыра і глыбока.

СЛУХАННІ

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І ДЗЯРЖАВА: МЕХАНІЗМЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Генадзь КЕСНЕР

**Першыя грамадскія слуханні пад такой назвай адбыліся ў Мінску 20 ліпеня. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі шэраг недзяржаўных арганізацый Беларусі. Запрошаныя да ўдзелу ў дыскусіі прадстаўнікі дзяржаўных структур — чальцы Грамадска-кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта — слуханні праігнаравалі.**

Са слоў лідэра кансорцыума «ЕўраБеларусь» (Літва) Улада Вялічкі, з таго, што ўлады праігнаравалі мерапрыемства, не варта рабіць трагедыю. «Гэта прыкмета таго, што пакуль такія слуханні не лічацца важнымі. Спадзяюся, што гэта часовая сітуацыя, і яна можа змяніцца. Было б добра бачыць на гэтых мерапрыемствах прадстаўнікоў дзяржавы, але будуць «слуханні–2», «слуханні–3», і, магчыма, тады ў іх будзе больш прычын і матываў прыняць у іх удзел», — мяркуе Улад Вялічка.

Варта адзначыць, што самі пяцігадзінныя слуханні вызначаліся некаторай нервознасцю, нягледзячы на адсутнасць прадстаўнікоў з боку дзяржавы. Прысутныя чальцы ГКР пры Адміністрацыі прэзідэнта старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта Алег Гулак, лідэр Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук, экс-дэпутат парламента Уладзімір Нісцюк і іншыя чамусьці выразна дакладна... 

выршылі, што падчас слуханняў яны будуць як мінімум экзікутаваныя, хоць яўным і шчырым песімістам, што да дзейнасці ГКР і нават самога яе стварэння, быў толькі палітолаг Уладзімір Мацкевіч: «Гэта камуфляж, стварэнне бачнасці лібералізацыі».

З іншага боку, адзначыў Мацкевіч, і самой беларускай грамадзянскай супольнасці, перад тым як задаваць важныя пытанні, уздымаць сур'ёзныя праблемы, неабходна арганізавацца ў самой сабе: «Беларуская грамадзянская супольнасць, хоць і існуе, і нават некалькі ў лепшым выглядзе, чым у некаторых краінах «Усходняга партнёрства», да якіх нас прыраўнялі, тым не менш, дагэтуль недастаткова арганізаваная, каб казаць сур'ёзныя рэчы ўслых».

Тым не менш, пераважная большасць тых, хто браў удзел у слуханнях, спрабавала знайсці шляхі «прасоўвання з нулявога пункту», на якім зараз знаходзіцца ўнутрыбеларускі дыялог.

Па словах палітолага Алеся Лагвінца, сёння адмаўленне ад дыялога, калі ўлада спрабуе стварыць «канструктыўны твар», магло б вельмі адмоўна адбіцца на дэмакратычнай супольнасці, якая б паказала сябе ў такім выпадку дэструктыўнай сілай і выклікала б раздражненне не толькі ўнутры Беларусі, але і ў заходніх партнёраў.

«Калі сёння мае месца нейкі момант кансалідацыі, давайце мы разам з вамі — тыя, хто ўваходзіць у розныя саветы, тыя, хто лічыць сябе грамадзянскай супольнасцю, а не толькі «трэцім сектарам», — сёння аб'яднаемся вакол гэтых праблем, звязаных з нашай інфармацыйнай прасторай, — заклікала кіраўнік БАЖ Жанна Літвіна. — Інфармаванне пра дзейнасць рады — пытанне сапраўды вырашальнае, за кожным застаецца права шырока даваць інфармацыю. Значыць, выкарыстоўвайце гэтую магчымасць, будзьце даступныя журналістам, давайце прэс-канферэнцыі. Але гэта не вырашыць прынцыповай праблемы: як прымусіць разглядаць самыя-самыя прыярытэтныя пытанні і прымаць па іх рашэнні».

Як адзначыла старшыня зарэгістраванага ў Літве «Праваабарончага альянсу» Людміла Гразнова, слуханні, што адбыліся, — «гэта надзвычай адказная рэакцыя грамадзянскай супольнасці на сённяшнюю сітуацыю і на дзейнасць кансультацыйных радаў. Калі мы прапануем падтрымку (сябрам ГКР — Г. К.) у выглядзе грамадскіх слуханняў, гэта напоўніцу адпавядае нашым інтарэсам, гэта дае шанец краіне. Калі мы «прыхлопнем» гэтую пляцоўку і скажам, што «сыходзім у інтэрнэт», мы будзем у гэтым «інтэрнэце» і дзесяць, і дваццаць гадоў. Гэты момант нельга дапусціць», — лічыць праваабаронца.

Па словах Пятра Марцава, у калідорах улады, прынамсі, у чальцоў Грамадска-кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, ёсць пэўная зацікаўленасць у дыялогу з грамадзянскай супольнасцю. «Я адчуваю, што яны хацелі б выслухоўваць меркаванні па нейкіх важных пытаннях, бо яны, з аднаго боку, лічаць, што зараз самы час для мазгавога штурму, а з іншага — вельмі важна зразумець настрой грамадства і стаўленне да нейкіх важных глабальных пытанняў. Так, я адчуваю цікавасць, можа нязначную, але цікавасць», — адзначыў Пётр Марцаў.

Але ў тым, што чыноўнікі насамрэч маюць такую цікавасць, можна будзе пераканацца, калі яны не пагрэбуюць наступнымі грамадскімі слуханнямі, якія для іх могуць быць вельмі карыснымі ва ўсіх сэнсах.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЯКІ НАЦЫЯНАЛІЗМ НАМ ПАТРЭБНЫ




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Сяргей НІКАЛЮК

**Культурным нацыяналізмам, такім папулярным сярод апазіцыі, пералік магчымых нацыянальных праектаў не вычэрпваецца. Асноўная праблема Беларусі — адсутнасць крытычнай масы грамадзян, што блакуе рэалізацыю праекту грамадзянскага нацыяналізму.**



У сваім артыкуле «Беларусь, Мінск, 3 ліпеня» (глядзі «НЧ» № 24 ад 3.07.2009) Аляксей Хадыка цытуе Уладзіміра Арлова: «Незалежнасць — гэта калі ад нараджэння да скону пачуваешся сваім чалавекам на сваёй зямлі». З гэтым азначэннем на першы погляд не паспрачаешся, але толькі на першы погляд.

Што робіць нас «сваімі» ў пэўнай сацыяльнай прасторы? Адказ просты — агульная культура. Калі мы кажам пра нацыянальную культуру, то яна, безумоўна, пачынаецца з мовы, але выключна да яе не зводзіцца. Тут будзе дарэчы прывесці яшчэ адну цытату: «Там, дзе… сэнсы, міфы і знакі перастаюць закранаць адчувальныя струны ў душах людзей перад тварам канкуруючых сэнсаў, міфаў і знакаў, — там і праходзіць культурная мяжа нацыі» (Антоній Сміт).

## Што такое культура

Даць адназначную дэфініцыю паняцця «культура» досыць складана, хаця б з-за наяўнасці велізарнай колькасці вызначэнняў. Культуролагі налічаюць іх сотні. Абярэм з гэтай разнастайнасці якое-небудзь простае. Напрыклад, такое: культура — гэта агульныя для вялікай групы людзей паняцці, устаноўкі, звычаі і асаблівасці паводзін, што перадаюцца ад пакалення да пакалення.

Нацыянальная культура, як ужо адзначалася, пачынаецца з мовы. Пры гэтым, аднак, наяўнасць «сваёй» мовы з'яўляецца зусім не абавязковай, каб пэўная агульнасць людзей змагла ўзняцца ў сваім развіцці да ўзроўню нацыі. Возьмем англамоўныя краіны. Хто адважыцца сцвярджаць, што ў Аўстраліі або ў Новай Зеландыі не склаліся нацыі? А Індыя? Дакладную колькасць моваў і дыялектаў, на якіх размаўляе насельніцтва краіны, мабыць, ведаюць толькі навукоўцы-мовазнаўцы, але ў якасці дзяржаўнай мовы бацькі-заснавальнікі незалежнай Індыі абралі англійскую і — як паказалі наступныя падзеі — не пралічыліся.

Ёсць яшчэ адзін цікавы прыклад — гэта Ізраіль. Будаўніцтва нацыі запатрабавала адмовіцца ад мовы, на якой размаўляла большая частка насельніцтва краіны. Справа ў тым, што перасяленцы 40-х гадоў размаўлялі ў асноўным на ідыш, які быў мовай галута (выгнання). Але сіянізм (рух за адраджэнне нацыянальнай незалежнасці габрэйскага народа на яго гістарычнай радзіме) чэрпаў свае сілы не з іудаізму, а з сусветнай культуры. Ён ставіў перад сабой тры задачы: парваць з галутам, стварыць новы народ і новага чалавека. Такі чалавек не мог размаўляць на ідыш. Іўрыт жа быў мёртвай мовай, ён не падыходзіў нават для побытавых зносін, тым больш для выкладання сучасных навук ва універсітэтах. Давялося на яго аснове канструяваць пасутнасці новую мову. І гэта задача была выкананая.

## Каму патрэбна гэта краіна

Вернемся да азначэння незалежнасці Уладзіміра Арлова і ўявім сабе тыповага чытача "НЧ" у асяроддзі прыхільнікаў беларускага «бацькі», якія размаўляюць «на мове». Ці адчуе чытач «НЧ» сябе пры гэтым сваім? Зразумела, не. Мне запярэчаць: маўляў, прыхільнікі «бацькі» — усе спрэс рускамоўныя. Такі погляд далёкі ад ісціны. «На мове» ў побыце размаўляе не толькі апазіцыйна настроеная інтэлігенцыя, але і жыхары шматлікіх сельскіх раёнаў. Вось чаму сярод тых, хто размаўляе па-беларуску, узровень падтрымкі ўлады вышэй. Гэта высnova, у прыватнасці, неаднаразова пацвярджалася падчас сацыялагічных апытанняў НІСЭПД.

У XV стагоддзі французскі паэт Франсуа Війон напісаў наступныя радкі (у перакладзе на рускую мову Ільі Эрэнбурга):

*«От жажды умираю над ручьем.*
*Смеюсь сквозь слезы*
*и тружусь играя.*
*Куда бы не пошел — везде мой дом.*
*Чужбина мне —*
*страна моя родная».*

Ці можа родная краіна, незалежнасць якой нікому і ў галаву не прыйдзе паставіць пад сумнеў, стаць чужынай для сваіх грамадзян, або гэта ўсяго толькі паэтычны вобраз? Дастаткова ўзгадаць фашысцкую Італію і нацысцкую Германію, каб зразумець актуальнасць словаў паэта.

Я нядаўна пабываў у Гродна, дзе перад дзвярамі польскага вучэбнага цэнтра «Мацеж школьна» назіраў чаргу маладых людзей. У кожнага ў руках былі пашпарты. Мне растлумачылі, што гэта выпускнікі гродзенскіх школ, якія атрымалі «Карту паляка», афармляюць дакументы для вучобы ў польскіх універсітэтах. Цікава, які працэнт з іх пасля атрымання адукацыі вернецца ў родную Беларусь? Паміж сабой яны размаўлялі па-беларуску, але ці падвысіць гэта іх шанец на вяртанне?

Калі казаць пра будаўніцтва беларускай нацыянальнай дзяржавы, варта задаць сабе пытанне, а хто канкрэтна зацікаўлены ў такім будаўніцтве? Адказ на яго, як гэта не падасца дзіўным, невідавочны. Сацыёлагі НІСЭПД рэгулярна пытаюцца ў беларусаў: «Ці хацелі б Вы пераехаць у іншую краіну на сталае месца жыхарства, калі б у Вас была такая магчымасць?» Дык вось, колькасць жадаючых за апошнія дзесяць гадоў ні разу не апускалася ніжэй 32 працэнтаў!

Якія ж канкрэтна сацыяльна-дэмаграфічныя групы выяўляюць гатоўнасць спакаваць валізкі і назаўжды развітацца з Радзімай? У першую чаргу гэта маладыя і адукаваныя жыхары вялікіх гарадоў (прыклад з чаргой каля польскага вучэбнага цэнтра). Яны не бачаць сваёй будучыні ў рамках «беларускай эканамічнай мадэлі», аднак не варта думаць, што ўся справа выключна ў мадэлі. Узгадаем, які адток моладзі пачаўся з Польшчы і краін Балтыі пасля іх уступлення ў Еўрасаюз.

Беларусам не пашанцавала, яны распачалі нацыянальнае будаўніцтва ў эпоху глабалізацыі, якая характарызуецца не толькі адносна свабодным рухам тавараў і капіталаў, але і працоўнай сілы. Класічны патрыятызм сёння дэманструюць толькі людзі старэйшага пакалення, і дэманстрацыя гэта вымушаная. На Захадзе іх ніхто не чакае, там і сваіх старых хапае.

## Хто кім авалодаў

Прэзідэнцкія выбары 2006 года ўлада нечакана правяла пад лозунгам «За Беларусь». Такі патрыятычны ўхіл для шматлікіх апазіцыйных палітыкаў стаўся нечаканым. Яны, натуральна, абвінавацілі ўладу ў банальным крадзяжы. Тут патрабуецца тлумачэнне. Справа ў тым, што нідзе і нікому яшчэ не ўдавалася манапалізаваць распрацоўку і рэалізацыю нацыянальнага праекту. Канчатковы вынік — заўсёды кампраміс, прычым кампраміс часовы. Ні ў адным грамадстве не існуе абсалютнага разумення нацыянальных інтарэсаў, у кожнай палітычнай групы яно сваё.

Тут самы час паразважаць пра віды нацыяналізму. Як гэта не падасца дзіўным, але сярод беларускай апазіцыі, якая выступае за еўрапейскі шлях развіцця Беларусі, пераважаюць прыхільнікі культурнага нацыяналізму. Адсюль і сталая засяроджанасць на праблеме адраджэння нацыянальнай культуры і мовы. Нацыянальная культура пры гэтым разумеецца выключна як «высокая культура», якой процістаіць навязаная звонку «культура нізкая».

Між тым, падзел культуры на высокую і нізкую, які існуе на штодзённым узроўні і ў публіцыстыцы, прафесійным культуролагам не вядомы. Звернемся ў чарговы раз да цытаты: «У строга навуковым сэнсе культура — гэта атрыбут кожнага чалавека. Калі ты належыш да віду «хома сапіенс», то знаходзішся ў прасторы пэўнай культуры. Ці пішаш ты на плоце слова з трох літар або чытаеш Гамера ў арыгінале — гэта ўжо варыянты культуры (Ігар Якавенка).

Сёння большасці народаў для выжывання ва ўмовах глабалізацыі патрэбна не захаванне сваіх культурных традыцый, а развіццё ад іх. Каб далёка не хадзіць за прыкладамі, звернемся да бягучых навін. Паводле паведамлення БелаПАН, у студзені-чэрвені 2009 года доля рэалізацыі алкагольнай прадукцыі ў агульным аб'ёме рознічнага таваразвароту склала 12 працэнтаў. Продаж гарэлкі павялічыўся на 2,4 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года. У Беларусі спажыванне чыстага алкаголю на душу насельніцтва перавысіла 12 літраў. Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначае крытычную рысу — 8 літраў, яе перавышэнне азначае фізічную дэградацыю насельніцтва.

Якое дачыненне мае прыведзеная статыстыка да беларускай нацыянальнай культуры? Ды самае наўпраставае. Алкагалізм — яе неад'емная частка, да таго ж частка, што прагрэсуе. Калі хтосьці з чытачоў «НЧ» у гэтым сумняецца, то няхай раніцай падыдзе да любой харчовай крамы хвілін за 10 да адкрыцця.

## Грамадзянскі нацыяналізм

У Еўропу, неабходна памятаць, што практычна ва ўсіх краінах ЕС сёння ў пераможцах апынуўся не культурны, а грамадзянскі нацыяналізм. Еўрапейскія нацыі — гэта ў першую чаргу нацыі грамадзян. Адсюль і знакамітае азначэнне нацыі, якое даў Дзейч: «Нацыя — гэта грамадства, якое авалодала дзяржавай, што ператварыла яго ў інструмент рэалізацыі сваіх грамадскіх (г. зн. нацыянальных) інтарэсаў».

У Беларусі ж мы маем процілеглую карціну. У нас дзяржава авалодала грамадствам. Яна рэалізуе, і не без поспеху, свой нацыянальны праект — праект дзяржаўнага нацыяналізму. У гэтым праекце ўсім нам прызначана роля не грамадзян, а падданых.

На якой мы будзем пры гэтым размаўляць мове — справа дзесятая. У Туркменістане ўсё размаўляюць па-туркменску, і з незалежнасцю ў іх праблем няма. Ці адчувае пры гэтым кожны туркмен сябе «сваім чалавекам на сваёй зямлі», мне цяжка сказаць. Даўно я з туркменамі не размаўляў. Але мае добрыя знаёмыя, якія шмат гадоў пражылі ў гэтай сонечнай рэспубліцы і дагэтуль тэлефануюць сваім прыяцелям, запэўніваюць, што там у іх усё выдатна. Ды інакш і быць не можа, калі абмяркоўваць крытычныя тэмы па тэлефоне прыяцелі маіх знаёмых катэгарычна адмаўляюцца.

**У Беларусі дзяржава авалодала грамадствам. Яна рэалізуе, і не без поспеху, свой нацыянальны праект — праект дзяржаўнага нацыяналізму. У гэтым праекце ўсім нам прызначана роля не грамадзян, а падданых**

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 27 ліпеня, панядзелак

### 1

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10, 15.25** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Nota Bene.
**09.40** «Здароўе».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Крымінальная меладрама «Новы рускі раманс» (Расія).
**12.10** Меладрама «Свая чужая сястра».
**13.45** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Камедыйны серыял «Нацыянальны здабытак» (Расія).
**16.50** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**17.50** Крымінальная меладрама «Новы рускі раманс» (Расія).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Украіна: 25-ы кадр». Відэафільм.
**20.00** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.30, 00.20** Камедыйны серыял «Офіс».
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці.
**10.40** Мультфільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Рэкламная паўза».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая цудоўная няня», 2004 год.
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.05** «Сетка». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Прафесійны бокс».
**00.30** Ударная сіла. «Акіянскі «Атлант».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Шырокая рака». Серыял.
**13.50** Фільм «Пакой Марвіна». ЗША.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Шырокая рака». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Першакурсніца». Расія.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».
**00.25** «Пантэра». Серыял. Закл. серыя.

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.40** Дак. фільм «Абаронка» (Беларусь).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Меладрама «Дзікі сабака Дзінга».
**12.25** Жаночая ліга.
**12.50** «Невытлумачальна, але факт».
**13.40** Мультфільм.
**13.50** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Таемны густ.
**15.15** Экспедыцыя.
**15.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.40** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.00** Медычныя таямніцы.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.15** Пасоўванне+.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Вяртанне Турэцкага».
**19.45** Бітва экстрасэнсаў.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** Фантастычная камедыя «Прыгоды Плута Нэша» (ЗША - Аўстралія).
**22.50** «Іншыя». Псіхалогія крыміналу.
**23.15** Вострасюжэтны серыял «Квіток у гарэм» (Расія). 1-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял «Кармэліта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** «Гарадок». Дайджэст.
**12.35** Тэлефільм «Хадня па пакутах». 11-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Пакой смеху».
**16.00** «Містэр Накаўт. Загадка Валерыя Папенчанка». Дакументальны фільм
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Кармэліта».
**21.25** Руская серыя. «Майстар і Маргарыта». Тэлесерыял.
**22.30** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**23.30** «Нічога асабістага».
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Аліпій-ваяр». Дак. фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Лебядзіны рай».
**08.55** «Следства вялі...».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Сярэдні клас».
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.15** «Рэпарцёр А. Зіненка.» Лепшыя фільмы.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** Серыял «Абарона Красіна».
**21.30** Баявік «Спецпрызн па-руску-2».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** Драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.25** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Чэхіі. Заезд 2.
**10.00** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**12.30** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 1-ы.
**14.00** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 10 м. Фінал.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Монтэлімар - Мон-Венту. 20-ы этап.
**16.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Монтэро Фо-Йон - Парыж. 21-ы этап.
**17.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў (Данецк, Украіна). Групавы этап. Іспанія - Францыя. Прамая трансляцыя.
**19.00** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Навіны.
**21.20** Вось дык так!!!
**21.35** Армрэстлінг. AL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг - Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў (Данецк, Украіна). Групавы этап. Украіна - Швейцарыя.
**02.00** Матаспорт на выхадных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**20.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.35** Госць «Белсату».
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнавачая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Несвядомыя», маст. фільм, 2004 г., Іспанія–Германія–Партугалія–Італія.
**23.00** Аб'ектыў.

## 28 ліпеня, аўторак

### 1

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** «Пікнік па-балтыйску». Відэафільм.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Карамболь».
**09.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.45** Крымінальная меладрама «Новы рускі раманс» (Расія).
**11.40** Відэафільм АТН «Пад Крычаўскім ветразем» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Фантастычны серыял «Эўрыка».
**13.05** Фантастычны серыял «Героі».
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Камедыйны серыял «Нацыянальны здабытак» (Расія).
**16.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.50** Крымінальная меладрама «Новы рускі раманс» (Расія).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Карамболь».
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.30, 00.20** Камедыйны серыял «Офіс».
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Дэтэктывы».
**10.30** Мультфільмы.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая цудоўная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Бурштынавы барон». Шматсерыйны фільм. Расія, 2007 год.
**22.05** «Сетка». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** Фільм «Дасканаласць».
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Першакурсніца». Расія.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Шырокая рака». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Уваскрэсенне класікі».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Шырокая рака». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кобра. Антытэрор». Серыял.
**21.30** «Крот». Серыял.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Надзвычайныя гісторыі».
**00.20** «Мамука». Серыял.

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Серыял «Два лёсы» (Расія).
**11.55** Моладзевы дэтэктыўны серыял «Вераніка Марс-2» (ЗША).
**13.15** Жаночая ліга.
**14.05** Невытлумачальна, але факт.
**14.55** Мультфільм.
**15.10** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.40** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.00** Медычныя таямніцы.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.15** Пасоўванне+.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Вяртанне Турэцкага».
**19.45** Калыханка.
**20.00** Бітва экстрасэнсаў.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** Спорт-кадр.
**21.30** Крымінальная драма «Прызнанне небяспечнага чалавека» (ЗША - Вялікабрытанія - Германія).
**23.30** «Іншыя». Псіхалогія крыміналу.
**00.00** Вострасюжэтны серыял «Квіток у гарэм» (Расія). 2-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял «Кармэліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Руская серыя. «Майстар і Маргарыта». Тэлесерыял.
**12.35** Тэлефільм «Хадня па пакутах». 12-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**15.10** «Дарагі Леанід Ілліч!». Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармэліта».
**21.25** Руская серыя. «Майстар і Маргарыта». Тэлесерыял.
**22.30** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі+».
**00.05** «Лёс паэта. Лебядзеў-Кумач». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Лебядзіны рай».
**09.00** «Дачныя адказ».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.45** «Асоба небяспечны!».
**11.15** Вострасюжэтны баявік «Спецпрызн па-руску-2».
**12.05** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** Серыял «Аэрапорт».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Абарона Красіна».
**21.30** Вострасюжэтны баявік «Спецпрызн па-руску-2».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** Драма «Берыя. Пройгрыш».
**00.20** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 2-і.
**10.00** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**12.30** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 2-і.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў (Данецк, Украіна). Групавы этап. Украіна - Швейцарыя.
**15.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў (Данецк, Украіна). Групавы этап. Іспанія - Францыя.
**17.30** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 2-і.
**18.45** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**21.00** Лёгкая атлетыка. Супер Гран-пры IAAF у Манака. Прамая трансляцыя.
**23.30** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Матаспорт на выхадных.
**00.30** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету ў Італіі (Сан Бенедэта Дэль Тронта). Клас Р1.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC у Японіі. Агляд.
**01.15** Плаванне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Рым). Дзень 3-і.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча», серыял.
**19.55** Беларусы ў Польшчы.
**20.15** Акно ў Еўропу.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедзімін» (спазнавачая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.25** Еўропа сёння.
**23.00** Аб'ектыў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# УСХОДНЯЕ ПАРТНЁРСТВА

**Алег НОВІКАЎ**

**Нягледзячы на тое, што праграма «Усходняга партнёрства», удзельніцай якой ёсць таксама Беларусь, фармальна ўжо працуе, але і зараз працягваюцца спрэчкі, чым ёсць гэта партнёрства і якія яго канчатковыя мэты?**

Ідэя «Усходняга партнёрства» (EaP — ад англ. «*Eastern Partnership*») сталася своеасаблівай рэакцыяй некаторых усходніх краін ЕС на ініцыятыву Нікаля Сарказі. 13 ліпеня 2008 года на саміце ў Парыжы лідэры краін Міжземнамор'я і Еўрасаюза падпісалі дамову пра стварэнне «Саюза за Міжземнамор'е» (G-Med). G-Med аб'ядноўвае ўсе краіны ЕС плюс 10 краін рэгіёна (Лівія ўвайшла ў G-Med у якасці назіральніка). Сярод галоўных мэтаў G-Med пытанне інтэграцыі ў ЕС не значыцца. Размова ідзе пра «развіццё эканомікі», «падтрымку пабудовы прававаых дзяржаў», «абарону навакольнага асяроддзя», «распрацоўку ўзгодненай іміграцыйнай палітыкі».

25 мая, напярэдадні саміту ў Парыжы, на пасяджэнні Савета ЕС Швецыя, Чэхія і Польшча прапанавалі праект праграмы «Усходняе партнёрства». Палітолагі, якія арыентуюцца ў тым, што адбываецца на брусельскай кухні, прызнаюць: аўтарам праекту фантастычна пашчасціла. У іншай сітуацыі іх прапанова згубілася б у нетрах еўрапейскай бюракратыі. Падзеі скламіся такім чынам, што на пачатак лета 2008 года ЕС пачаў губляць ініцыятыву на ўсходнееўрапейскім накірунку з-за таго, што маральна быў не гатовы да новай фазы пашырэння. Аднак шэраг фактараў прывёў да таго, што перавага сілаў аказалася на баку прыхільнікаў актывізацыі ўсходняга вектару палітыкі Еўропы.

Гэтых фактараў было як мінімум тры:

- Глабальны эканамічны крызіс. Рост палітычнай і сацыяльнай напружанасці ў былым СНД.
- Энергетычны крызіс. Шэраг газавых войнаў Масквы з Украінай і Беларуссю, заложнікамі якіх сталі еўрапейцы.
- Расійска-грузінскі вайсковы канфлікт.

У выніку напрыканцы таго ж лета 2008 года на парадку дня паўстала пытанне адэкватнай рэакцыі ЕС на новыя выклікі. Сумесная польска-чэшска-шведская ініцыятыва, агучаная ў маі, аказалася адзіным канструктыўным варыянтам.

Старт праекту быў дадзены ў Празе на майскім саміце ЕС. Там былі зацверджаны план, які стварае новыя структуры адносінаў паміж Еўрасаюзам і Украінай, Малдовай, Грузіяй, Азербайджанам, Арменіяй ды Беларуссю. Задэклараваная мэта «Усходняга партнёрства» — «умацаванне стабільнасці, эфектыўнага кіравання і эканамічнага развіцця краінаў, якія маюць стратэгічную важнасць для ЕС».

600 мільёнаў еўра, вылучаныя Еўрасаюзам на 2010–2013 гады для рэалізацыі праграмы «Усходняга партнёрства», будуць размяркоўвацца паміж шасцю краінамі. Краіны самі прапаноўваюць праекты. Брусель абірае.

Відавочна, што палітыка сяброўства з суседнімі краінамі пасуе базавым прынцыпам знешняй палітыкі Еўрасаюза. Адпаведна, падобныя на «Паўночнае вымярэнне» праграмы (у сукупнасці з яго балканскім варыянтам «*Stabilization and Association Process*»), тыя ж «Паўночнае партнёрства», «Усходняе партнёрства», у прынцыпе не трэба разглядаць апрыёры як нейкія інтэграцыйныя праекты нізкай інтэнсіўнасці.

«Усходняе партнёрства» не ёсць інстытуцыянальна афармленая арганізацыя. Праграма мае ўласны сакратарыят, але ён падпарадкоўваецца Еўракамісіі і фінансуецца з яе бюджэту. Еўракамісія прызначыць адмысловага каардынатара праграмаў. Лідэры краін, якія ўдзельнічаюць у праграме «Усходняе партнёрства», раз на два гады будуць збірацца на сустрэчы ў Брусэлі. Акрамя таго, штогод падобныя сустрэчы арганізуюць для міністраў замежных спраў.

Нацыянальным парламентам прапануецца стварыць парламенцкую асамблею «Усходняга партнёрства», а няўрадавым арганізацыям гэтых шасці краін — «Форум грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства».



Ужо з 5 чэрвеня пачаліся першыя шматбаковыя кансультацыі ў рамках тэматычных платформаў. Вынікам кансультацый павінна стаць распрацоўка асноўных накірункаў супрацоўніцтва і абмеркаванне некалькіх прапанаваных з боку ЕС ініцыятыў.

Вось гэтыя платформы:

- дэмакратыя, належнае дзяржаўнае кіраванне і стабільнасць;
- эканамічная інтэграцыя;
- пытанні энергетычнай бяспекі;
- кантакты паміж людзьмі.

Што непасрэдна можа даць праграма «Усходняе партнёрства» Беларусі і беларусам?

Натуральна, перш за ўсё — паніжэнне кошту шэнгенскіх віз для грамадзян Беларусі, які цяпер з'яўляецца самым высокім на кантыненце і складае 60 еўра. У доўгатэрміновай перспектыве магчымая нават поўная адмена віз. Аднак у прынцыпе «Усходняе партнёрства» абяцае не маментальныя і непасрэдныя, а хутчэй ускосныя і доўгатэрміновыя бонусы ў розных сферах. Трэба прызнаць: «Усходняе партнёрства» будзе праграмай, не вельмі насычанай грашыма.

Для параўнання: 8 з 12 мільярдаў еўра, які ЕС выдаткоўвае на знешнюю палітыку ў 2007–2013 гадах, пойдуць на пашырэнне сувязяў з краінамі Паўночнай Афрыкі. Аднак у той жа час «Усходняе партнёрства» абяцае Украіне, Беларусі, Малдове, Грузіі штосьці больш важнае за грошы — магчымасць доступу да самога ёмкага на планеце еўрапейскага рынку. Праграма дазволіць адкрыць шырэйшы доступ для інвестыцый у Беларусь. Абмен паміж ВНУ і стажыроўкі чыноўнікаў адкрываюць магчымасці павышэння якасці адукацыі, працы адміністрацыі, заканадаўчага працэсу.

**Двухбаковыя стасункі паміж ЕС і беларускімі ўладамі маглі б значна пашырыцца, калі б апошнія ўзялі ўстойлівы курс на наладжванне дыялога з грамадскай супольнасцю**

Праграма яшчэ толькі стартуе, аднак тыя праекты, якія ўжо абмяркоўваюцца, здаюцца дастаткова перспектыўнымі. Напрыклад, літоўскі МЗС заявіў, што ў рамках партнёрства Літва і Беларусь маюць намер рэалізаваць такія праекты, як аўтамагістраль Мінск — Клайпеда, уключыць Беларускую чыгунку ў транспартны калідор Усход—Захад. Таксама будуць спрошчаныя працэдуры пераходу мяжы.

Адзіная праблема — наколькі сама Беларусь гатовая да «Усходняга партнёрства»?

Двухбаковыя стасункі паміж ЕС і беларускімі ўладамі маглі б значна пашырыцца, калі б апошнія ўзялі ўстойлівы курс на наладжванне дыялога з грамадскай супольнасцю. Прадстаўнікам трэцяга сектару нават дадзена права голасу пры выбары пытанняў для абмеркавання на тэматычных пляцоўках. Ці пагодзіцца на такі фармат працы афіцыйны Мінск? Ці працягне рабіць стаўку на кулуарных пасядзелкі і ігнараванне шырокай дыскусіі з-за страху, што яна стане публічнай?

ЕС неаднаразова падкрэсліваў, што гэта ініцыятыва не скіраваная супраць каго б тое не было. Расія застаецца ключавым партнёрам для ЕС, а ЕС зацікаўлены ў тым, каб удзельнікі «Усходняга партнёрства» мелі добрыя адносіны з іншымі суседзямі, у тым ліку з Расійскай федэрацыяй.

У вачах расійскага палітыкуму, гэта праграма — не што іншае, як ініцыятыва, накіраваная на дэзінтэграцыю постсавецкай прасторы і паслабленне ўплыву Расіі ў СНД. Прэм'ер Уладзімір Пуцін адкрытым тэкстам параўнаў «Усходняе партнёрства» з «альтэрнатывай пашырэнню NATO на Усход».

З іншага боку, менавіта Расія раней за ўсе іншыя краіны СНД пачала браць удзел у праграмах, вельмі падобных да «Усходняга партнёрства». Маецца на ўвазе так званае «Паўночнае вымярэнне» — форум ЕС і краінаў Паўночнай Атлантыкі, якія не ўваходзяць у еўрапейскія структуры (Ісландыя, Нарвегія і Расія). «Паўночнае вымярэнне», чыя канцэпцыя падобная на ідэю «Усходняга партнёрства», было абвешчана яшчэ ў 1997 годзе ў Люксембургу. З тых часоў Расія ахвотна карыстаецца публічнымі фондамі ЕС і пры гэтым чамусьці дасюль не стала сябрам *NATO*. Толькі за мінулы 2008 год у рамках кааперацыі па лініі «Паўночнага вымярэння» на тэрыторыі Расіі ЕС фінансаваў 4 экалагічных праекты. Агульная колькасць інвестыцый склала 22 мільёны еўра. І гэта толькі летась. Нядаўна завяршылася чатырохгадовая сумесная расійска-канадская праграма «Паўночнае партнёрства».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Зараз, кажуць, ігральны бізнес пераедзе да хітрага Лукашэнкі, які ў апошні час з антыліберальнага палітыка паступова ператвараецца ў сярэднееўрапейскага начальніка. Цяпер там, у Беларусі, будуць зіхацець неонавыя шыльды. Дажыліся — у Беларусі паўстануць Ганконг і Лас-Вегас, а рускі Іван працягне займацца звыклай справай — ляжаць на печы і клясці Захад.

**Polit.ru (Расія)**

Узгадаем, напрыклад, апошні скандал з малочнай прадукцыяй з Беларусі. Беларусы не здолелі своечасова змяніць этыкеткі, хоць і былі папярэджаныя загадзя. Зараз усе ведаюць, што скандал шчасліва вырашыўся, але не ўсе чулі, што беларускі «малочны» экспарт не толькі захаваўся, але і ўзрос на 40 мільёнаў долараў. А што зрабіў Аляксандр Лукашэнка падчас гэтага, можна зараз сказаць, інцыдэнту? Адмовіўся ўдзельнічаць у пасяджэнні Арганізацыі дамовы калектыўнай бяспекі (АДКБ). Гэта вельмі сур'ёзны крок. Бяспека дзяржаў — занадта важная рэч, і яна ні ў якім разе не павінна залежыць ад настрояў аднаго чалавека.

**«Голос России» (Расія)**

Адносіны паміж Масквой і Мінскам увайшлі ў новую, канфліктную фазу. Апошні канфлікт такога кшталту быў у 2006 годзе, падставай для якога сталі тарыфы на транзіт расійскай нафты праз Беларусь у Еўропу. Доўгі час козырам Лукашэнкі ў дыялогу з расійскім кіраўніцтвам заставалася пытанне будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, але калі сама гэта тэма сябе вычарпала (як мінімум у сярэднетэрміновай перспектыве), з'явіўся новы джокер — статус Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

**«Трейл.ру» (Расія)**

Калі ўлічыць апошнія падзеі ў беларуска-расійскіх адносінах — адмову Расіі ў выдачы крэдыту, «малочную вайну», дэманстратыўнае нез'яўленне Лукашэнкі на саміт АДКБ, — то прычын сустракацца больш чым дастаткова. Але Лукашэнка магчымасцю паразмаўляць з Мядзведзевым не скарыстаўся. І адмова кіраўніка Беларусі прыехаць у Маскву — гэта не адсутнасць цікавасці да коней і жакеяў. Гэта дэманстрацыя таго, што Аляксандру Рыгоравічу з Дзмітрыем Анатольевічам нават размаўляць не вельмі хочацца. Падобна, гэта ўзаемна.

**«Новая газета» (Расія)**

Але, нягледзячы на ўсе крокі насустрач Захаду, у Мінска няма сродкаў, каб атрымаць «развод» ад Масквы. Лукашэнка, які знаходзіцца ў эканамічнай залежнасці ад Расіі, спрабуе лавіраваць паміж Захадам і Масквой. Ён спрабуе атрымаць карысць ад дыпламатычнай напружанасці, якая ім жа самім і нагнятаецца. Магчыма, менавіта дзякуючы такой палітыцы нікому не вядомы ў 1994 годзе папуліст дагэтуль ва ўладзе. Хоць у самым пачатку ніхто не прадказваў яму доўгай палітычнай будучыні.

**«Le temps» (Швейцарыя)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГІБРАЛТАР. БРЫТАНЦЫ НЕ ЗБІРАЮЦЦА СЫХОДЗІЦЬ



Прэм'ер-міністр Гібралтара Петэр Карыяна, міністр замежных справаў Іспаніі Анхаль Марацінас і яго брытанскі калега Дэвід Мілібэнд

Міністр замежных справаў Іспаніі Мігель Анхель Марацінас наведаў Гібралтар. Візіт можна без перабольшання назваць гістарычным. З таго часу, як у 1704 годзе англійскія войскі захапілі «скалу», ні адзін сябра іспанскага кабінета не ступаў на зямлю Гібралтара.

Мадрыд і сёння патрабуе вярнуць тэрыторыю Іспаніі. Напярэдадні паездкі Марацінас заявіў, што Іспанія ніколі не адмовіцца ад Гібралтара. Лондан катэгарычна не збіраецца нават абмяркоўваць гэтую тэму. Кіраўнік іспанскага МЗС змог наведаць апошнюю брытанскую калонію пры ўмове, што пытанне пра вяртанне Гібралтара ў склад Іспаніі разглядацца не будзе.

Іспанія пагадзілася з патрабаваннямі брытанцаў. Марацінас у Гібралтары вёў перамовы з Дэвідам Мілібэндам, калегам з брытанскага МЗ, выключна па пытаннях эканамічнага і юрыдычнага характару.

Здзейсніўшы вояж, Марацінас наклікаў на сябе крытыку з боку лагера кансерватыўнай апазіцыі. Яны кажуць, што сваімі паводзінамі міністр паменшыў моц іспанскіх дамаганняў на калонію. А ў самім Гібралтары выказвалі асцярогу, што Іспанія, наадварот, будзе пасля гэтага яшчэ актыўней дамагацца вяртанні тэрыторыі.

У любым выпадку, статус Гібралтара не можа быць прадметам перамоў, пакуль яго насельніцтва амаль аднагалосна выказваецца за тое, каб тэрыторыя заставалася брытанскай. Гэта жаданне пацверджанае і рэферэндумам.

Дарэчы, гібралтарскі прыклад зараз вельмі цікавіць расійскі МЗС. У Маскве думаюць, а ці не правесці падобны рэферэндум на Курылах, на якія прэтэндуе Японія.

**По матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### УКРАІНА. ЗАЦВЕРДЖАНЫ ВЯЛІКІ ГЕРБ УКРАІНЫ

Украінскі ўрад зацвердзіў праект Вялікага герба Украіны. Гэта выява трызуба ў цэнтры, а па баках — постаці льва і запарожскага казака, унізе — сіне-жоўтая стужка, а зверху — княжая карона.

Праект быў прыняты па выніках конкурсу на лепшы эскіз вялікага Дзяржаўнага герба Украіны. Перамагла група з пяці чалавек пад кіраўніцтвам гісторыка Юрыя Саўчука. Яны малявалі сімвал амаль тры месяцы.

У новага герба адразу знайшліся крытыкі з «Партыі рэгіёнаў», якая знаходзіцца ў апазіцыі. Паводле іх словаў, «Вялікі герб павінен паказваць гісторыю ўзнікнення земляў і збіранне іх вакол цэнтра. Значыць, Вялікі герб павінен выглядаць інакш. У цэнтры павінен быць малы герб і герб сталіцы, а вакол — кампанавацца гербы гістарычных земляў галоўных гарадоў Украіны. У дадзеным выпадку, атрымліваецца, што пра знак Кіева папросту забыліся. Затое ёсць гербы Львова і Запарожжа, якія ніколі не былі сталіцамі. Гэта папросту правакацыя, прычым гістарычна непісьменная».

Зрэшты, ухвала ўрада яшчэ не азначае, што менавіта гэты варыянт герба атрымае Украіна. Зараз праект будзе накіраваны на разгляд Вярхоўнай Радзе — за яго прыняцце павінны прагаласаваць дзве трэціны дэпутатаў.

**Па матэрыялах «Голас Украіны» (Украіна)**

### НІКАРАГУА. 30 ГАДОЎ САНДЫНІСЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Роўна 30 гадоў таму пала дыктатура Самосы, чыя сям'я кіравала Нікарагуа на працягу амаль паўстагоддзя. І ўвесь гэты час у краіне працягвалася партызанская барацьба, арганізаваная Фронтам нацыянальнага вызвалення імя Аўгуста Сандына (*FSLN*). У 1979 годзе эра Самосы закончылася. Атрады сандыністаў захапілі сталіцу Манагуа. Увесь свет вітаў іх перамогу.

Захапіўшы ўладу, сандыністы, аднак, нарабілі шмат чаго. Пасварыліся з ЗША, што каштавала краіне грамадзянскай вайны і 20 тысяч забітых нікарагуанцаў. Развалілі эканоміку, спрабуючы будаваць сацыялізм па кубінскай мадэлі. У прынцыпе гэта ўсё была дробязь, пакуль СССР аказваў братам Артэга (кіраўнікам *FSLN*) матэрыяльную і ваенную дапамогу. Аднак з пачаткам Перабудовы савецкія пастаўкі прыпыніліся, і сандыністы былі вымушаны пагадзіцца на дэмакратызацыю. Першыя ж выбары яны прайгралі.

Праўда, у 2007 годзе яны вярнуліся ва ўладу, што цяпер з аглядкай на падзеі апошніх 30 гадоў дае ім законнае права лічыць сябе пераможцамі. Парадаксальна, аднак шмат удзельнікаў падзей 1979-га — фактычна ўвесь касцяк першага сандыніцкага ўраду — глядзяць на справы больш скептычна. «Фронт цяпер не левы, не правы, а нейкая сямейная фірма. Даніэль Артэга, яго жонка і дзеці кантралююць усе ведамствы», — кажуць ветэраны, якія ў розныя часы з розных прычын былі выкінуты з шэрагаў партыі.

Прадстаўнікі *FSLN* не згодныя з такімі высновамі. Пасля прыходу да ўлады яны вярнулі бясплатную адукацыю і медыцыну. Запусцілі праграму будаўніцтва сацыяльнага жылля. Хаця тут трэба сказаць вялікі дзякуй Уга Чавесу. Каракас штогод дае Нікарагуа 500 мільёнаў долараў у якасці бясплатнай дапамогі менавіта на сацыяльныя праграмы.

**Па матэрыялах «Die Welt» (Германія)**

ЛЕВЫЯ

# АПОШНІЯ З МАГІКАН

*Алег ПЯТРОЎ*

**Еўрапейскі левы тэрарызм памёр. У Германіі склала зброю адна з апошніх экстрэмісцкіх груповак, касцяк якой, як лічыць прэса, складалі супрацоўнікі штазі Усходняй Германіі.**

У чэрвені 2001 года некалькі супрацоўнікаў нямецкай урадавай арганізацыі, што займалася пытаннямі кампенсацый грамадзянам СССР, якіх прымушалі працаваць у нацысцкай Германіі падчас вайны, атрымалі лісты з пагрозамі.

У лістах было напісана, што адрасаты заслугоўваюць смерці, паколькі плацяць былым вязням нацызму занадта мала. Лісты былі напісаны ад імя арганізацыі «Militante gruppe» (ням.: «Вайсковая група»). У прэсе таксама часта выкарыстоўвалася абрэвіятура MG.



Берлін. 4 верасня 2006 года. Машына, падпаленая сябрамі «Вайсковай групы»

22 чэрвеня 2001 года, у гадавіну пачатку аперацыі «Барбароса», невядомыя падпалілі філіял аўтамабільнай кампаніі «Daimler-Benz». Адказнасць зноў узяла на сябе «Вайсковая група». Яна абвінавацціла прадпрымальнікаў у тым, што яны карыстаюцца пладамі прымусовай працы вязняў часоў другой сусветнай вайны і пры гэтым не жадаюць несці адказнасць за эксплуатацыю. Падпалы працягваліся і пазней. Іх ахвяры неслі матэрыяльныя страты за тое, што яны расісты, імперыялісты, фашысты, разбуральнікі сістэмы сацыяльных гарантый і г. д.

Часам групоўка спрабавала адысці ад абстрактных лозунгаў і рэагаваць на актуальныя падзеі. Так, у 2004 годзе мілітанты падпалілі Бюро па ўладкаванню беспрацоўных у знак салідарнасці з пратэстамі супраць прыняцця антысацыяльнага закону Hartz IV.

Так ці інакш, толькі за адзін 2007 год актывісты «Вайсковай групы» ўмудрыліся падпаліць 91 машыну, што прынесла ім вядомасць і імідж сучасных Робін Гудаў.

«Яны дакладна плануюць акцыі, яны шукаюць месцы, дзе ніхто не будзе ім замінаць. Звычайна гэта цэнтр Берліна. Калі няма мінакоў, яны спакойна падыходзяць да машыны, кладуць сродак для распальвання кастроў на машыну, падпальваюць яго і пакідаюць месца злачынства. Праз некалькі хвілін машына згарае», — так апісваў дзейнасць мілітантаў «Die Zeit».

Групоўка спрабавала пашырыць шэрагі сваіх прыхільнікаў за кошт дэбатаў у левай прэсе. «Вайсковая група» правакавала дыскусію на старонках розных левых выданняў і сайтаў, яна ставіла на інтэрнэт-форумы такія вось тэксты: «Мы сыходзім з таго, што працэс адраджэння рэвалюцыйных левых ляжыць у галіне палітычнай вайсковай дзейнасці».

У 2005 годзе MG выклікала сур'ёзныя дэбаты на старонках галоўнага левага выдання Берліна «Interim». У выніку такія дзеянні групоўкі далі спецслужбам нейкую нітачку. Супрацоўнікі крымінальнай паліцыі пачалі рабіць маніторынг дэбатаў, вызначаць тых, хто сімпатызуе MG, спрабаваць праз IP-адрэсы вызначыць тых, хто канкрэтна спявае оду тэрарызму. Ім удалося выйсці на канкрэтных асобаў, якія пісалі падобныя каментары. Гэтых асобаў узялі пад нагляд, пачалі адсочваць іх кантакты, праглядаць іх пошту. Так паліцыя выйшла непасрэдна на актывістаў «Вайсковай групы».

**Працэс над MG пачаўся 1 жніўня 2007 года. Іх абвінавацілі ў тым, што яны былі сябрамі тэрарыстычнай арганізацыі і непасрэдна падпалілі некалькі машын Мінабароны**

Было арыштавана чатыры асобы. Пры гэтым журналісты адразу пачалі надзімаць мыльныя бурбалкі. «Focus» пісаў, што адзін з тых, каго абвінавацілі ў сяброўстве ў MG, — асабісты сябра тагачаснага канцлера ФРГ Герхарда Шродэра. Пазней рэдакцыя выдання прызнала, што гэта была качка.

Судовы працэс над сябрамі MG пачаўся 1 жніўня 2007 года. Падсудных абвінавацілі ў тым, што яны былі сябрамі тэрарыстычнай арганізацыі і непасрэдна падпалілі некалькі машын Мінабароны.

Працэс адразу выклікаў вялікі скандал. Прычынай сталі доказы паліцыі. Зрабіўшы лінгвістычную экспертызу тэкстаў групоўкі, следчыя звярнулі ўвагу на дастаткова высокі інтэлектуальны ўзровень аргументацыі іх аўтара. Прычым апошні яўна добра ведаў сучасную сацыялогію, паколькі выкарыстоўваў адпаведную тэрміналогію. Засталася толькі даведацца, хто са студэнтаў сімпатызуе радыкальным левым і вывучае менавіта гэту галіну навукі.

У выніку «тэрарыст» быў арыштаваны. Праўда, федэральная пракуратура хутка аспрэчыла спробу прызнаваць людзей тэрарыстамі выключна за тэкстуальнае падабенства. Яна патрабавала дадатковых доказаў.

Такія недарэчныя крокі адразу ўзнялі на вушы ўвесь акадэмічны свет. Навукоўцы-сацыёлагі не толькі дапамаглі грашыма, каб наняць добрых адвакатаў, аднак да таго ж напісалі адкрыты ліст супраць крыміналізацыі сацыялогіі. Яго падпісалі 36 свяцілаў навукі. У выніку таго небараку студэнта-сацыёлага выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. Астатніх пакінулі за кратамі. Хутка пад заклад у 30 тысяч еўра выпусцілі і іншых, хаця працэс не завершаны да гэтага часу. Між тым, 7 ліпеня ў часопісе «Radikal» (забаронены ў ФРГ, друкуецца ў Нідэрландах) з'явілася новая заява мілітантаў. Яе можна лічыць сенсацыяй. Сябры групы напісалі, што яны распускаюць сваю арганізацыю. Самі мілітанты пішуць, што разбегчыся іх прымусілі ўнутраныя супярэчнасці.

Аднак галоўная інтрыга ў іншым. Раней крымінальная паліцыя зрабіла некалькі цікавых заяваў пра прыроду групы. Па словах іх прадстаўнікоў, у Германіі часам здараецца, што падлеткі анархісты або панкі гуляюць у тэрарыстаў. Аднак у выпадку MG размова вядзецца пра іншае. Група ідэнтыфікавала сябе не як анархістаў, а як рэвалюцыйных камуністаў. Пры гэтым яна разглядала сябе як падмурак стварэння моцнай пралетарскай партыі. Гэта вельмі падобна на рыторыку левых тэрарыстаў 1960–70-х гадоў, у прыватнасці італьянскіх «Чырвоных брыгад».

Таксама эксперты звярнулі ўвагу на тое, што MG дасылала лісты з пагрозамі на адрас палітыкаў, якія жорстка крытыкуюць ГДР. Усё гэта дае падставу для шматлікіх спекуляцый наконт таго, што мілітанты былі былымі грамадзянамі ГДР і, магчыма, звязанымі са штазі. Інакш цяжка зразумець, як мілітанты маглі так доўга заставацца на волі. Праўду мы даведаемся пасля таго, як станець вядомыя вынікі судовага працэсу над той тройкай. Аднак, на думку шматлікіх палітолагаў, такая версія — яшчэ не самая горшая. Спецыялісты баяцца, што на фоне крызісу левых партый сфармавалася хваля агрэсіўных маладых левых нарцысаў, якія выражаюць сябе ў гвалтоўных акцыях.

ЦІКАВА



# MADONNA GO HOME!

Іван БІЧ

**Напярэдадні канцэрту Мадонны ў Варшаве ў краіне актывізаваўся рух супраць выступу вядомай спявачкі.**

Канцэрт Мадонны прызначаны на 15 жніўня. Продаж квіткоў пачаўся яшчэ ў лютым. Спачатку ніякага рэзанансу ў асяроддзі каталіцкіх фундаменталістаў запланаванае культурнае мерапрыемства не выклікала. Толькі прыблізна напачатку лета яны паглядзелі ў каляндар — і ў іх заняло мову. Канцэрт прызначаны ў вельмі важны для каталіцкіх вернікаў дзень — Узняцце на неба найсвяцейшай Панны Марыі (Мадонны).

Таму заўзятыя каталікі вырашылі: канцэрт мусіць быць забаронены, а яго ініцыятараў трэба прыцягнуць да адказнасці. Праўда, трэба прызнаць, што такую пазіцыю займае толькі фракцыя польскіх каталікоў. Афіцыйна Касцёл ніяк не каментуе запланаваны канцэрт. Аднак сярод тых, хто кажа «non possimus» (лац.: «не дазволім»), знайшлося дастаткова шмат вядомых асобаў, каб праблема Мадонны выйшла на першыя старонкі польскіх газет. Напрыклад, сярод пратэстуючых Станіслаў Макоўскі, былы капелан прафсаюзу «Салідарнасць». Пратэст падтрымаў і Лех Валенса.

Варта нагадаць, што пратэсты супраць выкарыстання рэлігійных сімвалаў у масавай культуры ў Польшчы ўжо сталі традыцыйнымі. У 1994 годзе часопіс «Wprost» на першай старонцы апрануў на твар Маці Божай Чэнстаховай маску як сімвал дрэннага стану экалогіі. Каталіцкая грамада гэтага не прабачыла. Справа супраць рэдакцыі дайшла нават да Камісіі па правах чалавека ў Страсбургу. Праўда, канчатковае рашэнне было ўсё ж на карысць журналістаў.

Шмат разоў у краіне адмяняліся выставы, дзе прысутнічалі элементы хрысціянскага культу. Не кажучы ўжо пра фільмы. Забараніць «Код да Вінчы» патрабавалі некалькі парламентарыяў.

Аднак вернемся да Мадонны. Непасрэдны арганізатар і лідэр антымаданістаў — Мар'ян Брудзінскі (44 гады), былы сябра правай Лігі польскіх сямей. 13 чэрвеня ён стварыў камітэт «Pro Polonia», які каардынуе акцыі пратэстаў супраць выступу Мадонны.

Прэса піша, што касцяк камітэту складаюць людзі, якія арганізавалі акцыю ў Быдгашчы, дзе група каталікоў у мінулым снежні сарвала спектакль-канцэрт па матывах Бібліі. Кульмінацыяй той імпрэзы павінен быў стаць зварот да публікі акцёра, які іграў Понцыя Пілата. Пілат, які судзіў Хрыста, хацеў прапанаваць гледачам самім, шляхам SMS-галасавання, вырашыць: адпраўляць Хрыста на крыж або памілаваць. Вернікі здзек з біблейскага сюжэту не дапусцілі.

Цяпер Брудзіньскі і яго прыхільнікі бамбардзіруюць лістамі адміністрацыю прэзідэнта і сталічную ратушу, патрабуючы забароны канцэрта з рэлігійных прычынаў. Акрамя таго, кожны дзень сябры камітэта ходзяць па цэнтру Варшавы з перапынкамі на малітвы і збор подпісаў. Кампанія Брудзіньскага мае відавочны поспех. Мар'ян ужо паспеў перасварыць паміж сабой усіх правых палітыкаў, якія вымушаны неяк каментаваць праблему Мадонны і тым самым ставіць сябе ў вельмі нязручнае становішча: Мадонна — мегазорка, што мае сотні тысяч прыхільнікаў, якія таксама ходзяць на выбары. З іншага боку, губляць каталіцкі электарат таксама не хацелася б. Хаця, як сведчаць апытанні, большасць палякаў супраць палітызацыі творчасці спявачкі. Тым больш, хапае прыкладаў, калі музыкі ўжо выступалі ў каталіцкія святы ў Польшчы.

Чаму фундаменталістам не падабаецца менавіта Мадонна? Каб адказаць на гэта пытанне, трэба ўзгадаць творчы шлях артысткі.

Уся кар'ера Мадонны — гэта паслядоўная правакацыя. Пачынаючы ад яе першага кліпу «Like a Virgin», які паказалі на MTV у 1984 годзе. Песня выклікала скандал. З таго часу правакацыі на глебе сексу сталі візіткай Мадонны. Дастаткова ўзгадаць яе пацалунак з Брытні Спірс падчас уручэння ўзнагарод на канале MTV у 2000 годзе.

Аднак гэтага ёй было мала. Хутка Мадонна адкрыла для сябе тэму рэлігіі. У кліпе «Like a prayer», запісаным у 1989 годзе, яна цалуецца з чарнаскурым Ісусам. Калі яна рабіла глабальны канцэртны тур у 2005 годзе (так званы Confession tour), Мадонна спявала на фоне вялікага чырвонага крыжа. Праўда, сама яна сцвярджала, што не збіралася крыўдзіць хрысціян. Для яе спевы на фоне крыжу былі сродкам прыцягнуць увагу грамадства да праблемы СНІДу.

Польскія правыя аглядальнікі кажуць, што Мадонна абавязкова выкіне які-небудзь антыхрысціянскі нумар у Варшаве. Хаця, калі меркаваць па папярэдніх канцэртах Мадонны ў рамках яе туру «Sticky Sweet Tour 2009», цяпер стаўка робіцца на тое, каб шакаваць публіку непрыстойнымі сексуальнымі позамі на сцэне. Можа, такой харэаграфіяй усё і абмяжуецца.

«З іншага боку, што вы хацелі ад Мадонны. Каля 80–90 працэнтаў зорак шоу-бізнесу атэісты, і антырэлігійныя правакацыі заўсёды былі часткай іх творчасці», — пішуць ліберальныя каментатары. Яны прапануюць Брудзіньскаму і кампаніі не замінаць Мадонне, а арганізаваць альтэрнатыўны канцэрт.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РАФАЭЛЬ КАРЭА



З'явіліся спекуляцыі наконт таго, што выбарчую кампанію прэзідэнта Эквадора Карэа фінансавалі тэрарысты. Гаворка вядзецца пра лявацкую партызанскую групоўку «Узброеныя народныя сілы Калумбіі» (FARC). Калумбійская пракуратура перадала ў прэсу запіс, які знайшлі ў аднаго з баевікоў FARC вясной мінулага года. На ім — сход камандзіраў атрадаў у 2006 годзе. Сярод іх вайсковы камандуючы арганізацыі Хорхе Брысеньё Суарэс. Ён кажа пра неабходнасць падтрымаць Рафаэля Карэа на выбарах. Дакладна можна пачуць фразу: «Дапамажыце Карэа грашыма і дамоўцеся наконт перамоваў з яго агентамі». Натуральна, Карэа і яго каманда заявілі, што гэты запіс — правакацыя з мэтай дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне. Цяжка сказаць, які вынік будзе мець кампрамат на Карэа. Справа ў тым, што ўсе матэрыялы былі знойдзеныя падчас нападу калумбійскага спецназу на лагер партызан, які знаходзіўся на тэрыторыі Эквадору. Раней калумбійцы сцвярджалі, што сярод трафеяў быў ноутбук аднаго з кіраўнікоў FARC, на якім быццам знаходзіліся файлы пра супрацоўніцтва партызан з Чавесам, Кастра і нават Мінскам. Пазней эксперты заявілі, што ўсе запісы на кампутары былі зробленыя штучна. Магчыма, калумбійцы папросту пераагучылі нейкія кадры. З іншага боку, вельмі эмацыйная рэакцыя Карэа кажа, што дыму без агню не бывае.



### МІНЦІМЕР ШАЙМІЕЎ

Прэзідэнт Татарстана праходзіць пацярпелым на незвычайным працэсе, які распачаўся ў аўторак у Казані. Судзяць былога прэс-сакратара прэзідэнта Ірэка Мурзаціна. Судзяць за тое, што ён быццам незаконным чынам збіраў інфармацыю пра былога боса, а потым выкладаў яе ў інтэрнэце. Прынамсі на Мурзаціна збіраюцца павесіць гучны скандал мінулага года, калі ўся рэспубліка стаяла на вушах з-за таго, што нехта кінуў у сеціва сенсацыйную навіну — на турэцкім курорце памёр Шайміеў. Давялося нават рабіць афіцыйную заяву, што лідэр татар жывы і здаровы. Адказнасць за з'яўленне той правакацыйнай інфармацыі пракуратура вешае на Мурзаціна, бо ён пракаментаваў тую навіну на сваім блогу. Яшчэ больш смешны доказ — кніга «Апошні прэзідэнт Татарстану», якую выдаў Мурзацін пару год таму. Пракуратура правяла экспертызу, якая ўстанавіла, што кніга — татальны паклёп на ўладу. Экспертыза заключалася ў тым, што 79 людзям даручылі прачытаць фаліянт. З іх трое заявілі, што пасля прачытання кнігі ў іх склалася ўражанне, нібыта Шайміеў — галоўны карупцыянер у рэспубліцы. Да таго, як кніга трапіла ім у рукі, яны ставіліся да Шайміева пазітыўна. Мурзацін патрабуе прысутнасці пацярпелага ў судзе і новай экспертызы ды пагражае зваротам у Еўрапейскі суд па правах чалавека.

### ГЕРХАРД ХУБЕР



Лідэр аддзялення правай аўстрыйскай партыі Саюз за будучыню Аўстрыі ў зямлі Ціроль (BZO), больш вядомай як партыя Йорга Хайдэра, завёў каханку, прычым эмігрантку з Грузіі. А гэта — моцны ўдар па іміджу партыі, якая выступае супраць эмігрантаў. Нябожчык Хайдэр нават марыў стварыць высока ў Альпах асобны лагер для ўсіх эмігрантаў. Больш таго, Хубер мае жонку і пяцёра дзяцей. Таму раман не вельмі пасуе яго кансерватыўнай рытарыцы. Аднак гэта толькі кветачкі. Далей болей. Хтосьці, хто ведаў пра амуры Хубера, пачаў яго шантажаваць. Хубер знайшоў сярод аднапартыйцаў людзей, якія пагадзіліся папужаць шантажыста. Адначасова стала вядома, што тая грузінка ўжо сама пачала шантажаваць жонку Хубера. І тут партыйцы Хубера праінфармавалі паліцыю, што іх лідэр замовіў замах на чалавека. Вось такая гісторыя... Як вынік — партыя ў крызісе. Са складу кіраўніцтва ўжо выйшла 8 з 12 чалавек. Цяпер галоўная інтрыга ў тым, ці выйдзе скандал за межы Цароля і дабярэцца да зямлі Карынцыя — галоўнай выбарчай цытадэлі Саюзу за будучыню Аўстрыі. Трэба прыгадаць, што дагэтуль партыя займала чацвёртае месца на палітычным полі Аўстрыі.

ПОГЛЯД

# Прафесар Дынглі: БЕЛАРУССЮ ЦІКАВЯЦЦА З-ЗА ЯЕ ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ

**Старшыня Англа-беларускага таварыства, прафесар Лонданскага універсітэта Джым Дынглі Беларуссю зацікавіўся некалькі дзесяткаў гадоў таму з падачы грэка-каталіцкага святара айца Аляксандра Надсана. Прафесійная зацікаўленасць спадара Дынглі нашай краінай хутка змянілася прыватнай — адсюль яго жонка. У Мінску прафесар бывае даволі часта, таму ведае пра ўсё, што адбываецца ў краіне. Якой Беларусь выглядае з-за Ла-Маншу, у Джыма Дынглі спрабавала высветліць Вольга Хвоін.**



***— Вы сочыце за развіццём падзей у Беларусі не першы год. Заўважаеце нейкія трансфармацыі ў грамадстве?***

— Сёння беларускі народ мае незалежнасць. Дваццаць гадоў таму гэтага не было. Іншая рэч, што да ўсведамлення сябе беларусамі ёсць розныя падыходы. Як мне падаецца, для многіх няма ўласнай гісторыі як фактару фармавання нацыі. Але людзі ведаюць, што жывуць у незалежнай дзяржаве, і гэта дапамагае падтрымаць сэнс нацыі. У вузкага кола людзей ён грунтуецца на больш шырокіх чынніках.

***— Беларуская мова знаходзіцца ў стане музейнага экспанату. Ёсць шыльды, абвесткі ў транспарце, але карыстаюцца ёй нямногія. Ці бачыце Вы як навуковец рэцэпты выпраўлення сітуацыі?***

— Калі народ сам не хоча ўжываць гэту мову, без прэсу нічога не зробіш. Я не бачу іншага выйсця, акрамя таго, каб увесь урад і парламент раптоўна перайшлі на беларускую мову, але гэтага не будзе.

***— Асабіста для Вас былі нейкія цяжкасці ў вывучэнні беларускай мовы?***

— Я ўсё жыццё займаўся славістыкай, вывучаў рускую мову. Таму для мяне не было праблем. Галоўная праблема — гаварыць па-беларуску. Суразмоўцаў у побытавым жыцці ў Мінску знайсці цяжка. Для многіх беларуская мова ледзь не на ўзроўні замежнай.

***— Прызначэнне на пасаду міністра культуры беларускамоўнага чалавека — Паўла Латушкі — некаторыя назвалі рэверансам у бок Еўропы...***

— Можа, і рэверанс. Бо сёння вы сябруеце больш з Брусселем, чым з Масквой, а заўтра можа быць наадварот. Хто здольны прадказаць?

***— Раней Вы ўзначальвалі Цэнтр выкладання моваў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Ці многа людзей цікавіліся Беларуссю?***

— Былі людзі, але іх можна палічыць на пальцах рукі. У апошнія гады цікаўнасць крыху ўзрасла. Але з палітычнага пункту гледжання. Цікаўнасць узрасла не да гісторыі, культуры, літаратуры, а менавіта да дзяржавы ў Еўропе з адметнай палітычнай сістэмай.

***— Паводле Вашых назіранняў, ці актыўна беларусы імкнуцца прыняць культуру краіны, якую абралі для эміграцыі?***

— Пасляваеннае пакаленне ехала ў Англію з многіх краінаў Еўропы, з лагераў. Яны сталі грамадзянамі Вялікабрытаніі, але захавалі моцнае пачуццё беларускасці. Цяпер гэта не так заўважна. Толькі некаторыя шчыльна трымаюцца беларускасці. У асноўным людзі вучацца, зарабляюць грошы, а затым вяртаюцца ў Беларусь ці з'язджаюць у Амерыку.

Ёсць беларусы, якія прыходзяць на нашы мерапрыемствы. Але вельмі шмат беларусаў увогуле не ўдзельнічаюць у жыцці дыяспары. Мне кажуць, што Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі вельмі палітызаванае, як і Англа-беларускае таварыства. У краіне многа беларусаў, але яны часцей далучаюцца да нейкіх расійскіх згуртаванняў. Шкада, але факт.

***— Цяпер актывізаваліся перамовы Мінска з Еўрасаюзам. Як Вы ацэньваеце гэтыя палітычныя гульні?***

— Гаварыць пра Еўропу, быць у Еўропе модна. Праўда, я не разумею, як беларусы сабе ўяўляюць гэту Еўропу. Думаюць, што будзе больш свабоды, менш падаткаў... Падаткі будуць (смяецца). Для Беларусі Еўропа — гэта ў многім адмова ад савецкага мінулага. Але на дадзеным этапе я не разумею, чаго Еўропа хоча ад Беларусі. Тут усё залежыць ад аднаго чалавека, і я не надта давяраю Беларусі як дзяржаве.

***— У беларускай прэсе многа шуму нарабіў Лонданскі інвестыцыйны форум. Як яго ўспрынялі англічане?***

— Я не магу пабачыць вынікаў гэтага форуму. Пытаўся ў пасла Беларусі ў Вялікабрытаніі Аляксандра Міхневіча, але атрымаў неканкрэтны адказ. Самае галоўнае тут робіць піяршчык Цімаці Бэл. Была публікацыя ў «Financial Times» пра Беларусь. І ў мяне з'явілася ўражанне, што калі не сам лорд Бэл яе пісаў, то яго памочнік. Шараговы, звычайны англічанін пра гэта нічога не ведаў.

***— Вы маеце дачыненне да беларускай бібліятэкі імя Скарыны ў Лондане, пра якую звычайна гавораць узнёсла. А ці ёсць нейкія цяжкасці ў арганізацыі працы бібліятэкі?***

— Мы імкнёмся атрымліваць новыя кнігі, але вельмі дорага каштуе дасылаць іх па пошце з Беларусі. Таму нам патрэбная дапамога тых, хто едзе з Беларусі ў Англію на ўласным транспарце. Рэгулярна такія людзі знаходзяцца, яны і прывозяць у бібліятэку кнігі. Цяпер бібліятэка налічвае больш за трыста тысяч тамоў. Для нас актуальна было б далучыцца да сусветнай сеткі бібліятэк. Але для гэтага трэба грошы, экспертыза. Пакуль мы гэтым не займаліся. Нацыянальная бібліятэка Беларусі надзвычай зацікаўленая ў супрацоўніцтве з намі. Хутчэй за ўсё, яны заклапочаныя тым, што будзе пасля айца Аляксандра Надсана. Я і сам гэтага не ведаю. Але ёсць будынак — і гэта галоўнае. Цяпер нашае слабае месца — адсутнасць рэкламы. Таму ў бібліятэкі нямнога чытачоў. Людзі і фінансы — галоўная наша праблема.

***— Ці будзеце Вы бліжэйшым часам звязаныя з Беларуссю іншымі справамі, апроч прыватных?***

— У кастрычніку ў Лондане пройдзе канферэнцыя, прысвечаная тысячагоддзю Літвы. Я пабачыў праграму — там не было ніводнага чалавека ад Беларусі і Украіны. Звярнуўся да арганізатараў, а мне адказалі, што ў праграме больш няма месца. Пасля ўсё ж знайшлі — і мы запрасілі гісторыка Генадзя Сагановіча. Гэта будзе першае мерапрыемства такога кшталту. Аташэ па культуры Літоўскай амбасады ў Вялікабрытаніі сказала мне, што яны хацелі б зладзіць канферэнцыю на больш шырокай базе, ёсць цікавасць і ў Польшчы. Але пакуль ёсць пытанні наконт фінансавання гэтага праекта.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

# Алена Макоўская: ПЕРШЫ КРОК ПАВІННА ЗРАБІЦЬ ДЗЯРЖАВА

**Пасля завяршэння працы пятага з'езда беларусаў замежжа новаабраная кіраўніца МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» Алена Макоўская падзялілася сваімі меркаваннямі адносна таго, як яна бачыць перспектывы супрацоўніцтва паміж беларусамі замежжа і дзяржавай.**

***— Ці задаволеныя Вы прысутнасцю на з'ездзе прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання?***

— «Бацькаўшчына» доўгі час апелявала да ўладаў у плане вырашэння пытанняў беларускай дыяспары. І я лічу заканамерным, што нарэшце мы былі пачутыя. Я спадзяюся, што наконт пытанняў, якія былі агучаныя на з'ездзе, наконт выніковых дакументаў будуць прынятыя пэўныя канструктыўныя крокі дзяржавы ў дачыненні да беларусаў замежжа.

***— У якім рэчышчы Вы бачыце магчымае супрацоўніцтва з дзяржавай?***



— «Бацькаўшчына» прадстаўляе інтарэсы сваіх сяброў. А сяброў у нас шмат, і раскіданыя яны па ўсіх кантынентах. Гэта людзі абсалютна розных палітычных поглядаў, канфесій, пакаленняў. Але ўсіх іх аб'ядноўвае адно — любоў да Беларусі. Гэтыя людзі вельмі шмат могуць даць сваёй краіне. Я думаю, што дзяржаўны інтарэс можа быць у падтрымцы гэтых людзей. Бо гэта — наш інтэлектуальны, эканамічны патэнцыял, гэтыя людзі могуць ствараць іміджавыя цэнтры Беларусі ў свеце. Таму натуральна, што ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і беларускай дыяспарай мусіць ажыццяўляцца на дзяржаўным узроўні. А «Бацькаўшчына», якая аб'ядноўвае суполкі беларусаў у 25-ці краінах свету, можа рабіць маніторынг заўваг і прапаноў, абараняць і прадстаўляць інтарэсы сваіх сяброў тут, будаваць разам наш беларускі дом.

***— Леанід Гуляка выказаў меркаванне, што прагучала мала прапаноў, якія тычыліся эканамічнага, гандлёвага прадстаўніцтва...***

— Такое пытанне таксама можа стаяць. Паралельна адбывалася секцыя бізнесоўцаў, былі прадстаўнікі нацыянальнага бізнесу. Ішла размова пра адказнасць бізнесу за развіццё нацыянальнай культуры. Я ведаю, што былі прапановы зрабіць пэўныя інфармацыйныя захады, каб да ініцыятывы далучалася больш людзей. Думаю, гэта можа быць першым крокам. Мы разумеем, што цяпер эканамічны крызіс, і важна прыцягненне інвестыцый, у тым ліку і ад беларусаў замежжа. Але хачу сказаць, што першы крок насустрач беларусам замежжа павінна зрабіць дзяржава. Калі ён будзе адчувальны, то беларусы замежжа адгукнуцца, пойдзе хваля пад'ёму культурных, эканамічных праектаў. Але Рэспубліка Беларусь мусіць паказаць, што беларусы замежжа ёй патрэбныя.

***— Якія бліжэйшыя задачы стаяць перад новаабраным кіраўніцтвам «Бацькаўшчыны»?***

— Першасная задача — навесці парадак у адпаведнасці з прынятымі праўкамі і дапаўненнямі ў дакументах з'езда, менавіта адносна праграмы дзейнасці арганізацыі, а таксама адносна прыняцця закона «Аб беларусах замежжа». Быў ухвалены шэраг дакументаў адносна беларускай культуры, ідэнтыфікацыі. Праблемы багата, і па многіх пытаннях мы будзем звяртацца да органаў улады Рэспублікі Беларусь, бо без іх немагчымае станоўчае вырашэнне гэтых пытанняў.

***— Напярэдадні з'езду многа размоў было наконт магчымай палітычнай афарбоўкі мерапрыемства, абмяркоўваліся кулуарныя інтрыгі.***

— Размоваў было шмат, бо шмат было людзей. Але давайце меркаваць па выніках. З'езд прайшоў канструктыўна, нармальна, станоўча, прынятыя нармальныя дакументы, людзі задаволеныя, і гэта галоўнае. Цяпер для нас пачынаецца штодзённая праца.

**Упаўнаважаны па справах рэлігіяў і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка:**

— Калі я буду пералічваць, з чым згодны, а з чым — не, то трэба патраціць яшчэ два дні. Дзяржаўныя органы ўлады ставяцца да беларусаў замежжа і гэтага з'езда, я лічу, з павагай. Дастаткова сказаць, хто тут быў і пра што сказаў. Я быў на з'ездзе ад пачатку да канца і валодаю сітуацыяй вельмі добра. Прагучала шмат слушных прапаноў. І, безумоўна, тыя матэрыялы, якія накіруюць у самыя высокія органы ўлады, будуць разгледжаныя, вывучаныя, і тое, што магчыма, будзе ўспрымацца так, як успрымае дзяржава. Хацелася б, каб гаварылася не толькі пра справы, звязаныя з беларускай мовай, законам аб замежжы. Хацелася б, каб больш было прапановаў узаемадзеяння, эканамічнага, гандлёвага і г. д. На жаль, гэтых прапановаў тут амаль не гучала. Будзем вывучаць матэрыялы з'езда і выбудоўваць да іх стаўленне дзяржавы.

НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# ГЕРАІНЯ ГЕТА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Першая і галоўная рэч, за якую хочацца падзякаваць Ганне Хітрык, — гэта тое, што яна непрыгожая. Не прыгожая той прыгажосцю, якую, паводле пануючых у грамадстве перакананняў, належыць мець любой жанчыне, што хоча зрабіць кар'еру акторкі або спявачкі. Вядучыя тэатральныя падмосткі і эстрада развілі нават у самага падрыхтаванага гледача трывалы ўмоўны рэфлекс: калі перад табой жанчына без дэкальтэ, доўгіх бліскучых валасоў і эфектнага макіяжу — гэта непрафесійна. Некалькі год таму я пабачыла па беларускім тэлебачанні сацыяльны ролік, які заклікаў не смеціць на вуліцах. Дзяўчына і хлопец нефармальнага выгляду, седзячы на лавачцы ў парку, раптам апынаюцца па вушы ў смецці, накіданым мінакамі. Парачка выглядала надзвычай бляклая, штодзённа і натуральна — нібы так і сядзела на той лавачцы, калі да іх падышлі з камерай. Яны здаваліся людзьмі з вуліцы. І калі праз некаторы час я даведалася, што гераіня роліка ні з якой не з вуліцы, а з вядучага драмтэатру краіны, мяне ахапіла шалёная радасць. Ад таго, што такую дзяўчыну прынялі. Спачатку на акторскі факультэт, а потым — у Купалаўскі.**



Фота Андрэя Лянкевіча

Гэта было толькі першае ўражанне. Калі мне давялося бліжэй пазнаёміцца з талентам Хітрык, выявілася, што горы смецця з роліка — гэта барыкады новага культурнага перавароту, а Ганна — своеасаблівая Свабода на іх.

## Пад вэлюмам кічу

Нягледзячы на лета, адносную цеплыню, доўгія дні і кароткія ночы, якія ўсе мы з вамі зараз перажываем, я мушу з сумам і трывогаю канстатаваць: мы жывем у няпростыя, змрочныя часы, спадарства. Часы, калі існаванне любога грамадзяніна Беларусі з ног да галавы ахутана кічам. Дзякуючы ідэалагічнай установцы — усё для народа — кіч стаў вядучым стылем новай эпохі. Пастаўляючы, галоўным чынам праз тэлевізар ды жоўты і глянцавы друк, культурны прадукт, што як найлепей задавальняе масавыя густы, дзяржава (эфект зачараванага кола) у той жа час гэтыя густы фармуе. У Беларусі чакаюць «Еўрабачанне» як Вялікдзень, парад на Дзень Рэспублікі — як Тройцу, а «Славянскі базар» — як Мядовы Спас: кліпамі, нарэзанымі з канцэртнай праграмы гэтага вядомага на ўвесь былы СССР поп-кірмашу, тэлевізійнікі кормяцца потым усю зіму, як пчолы мёдам.

Краіна распалавінілася паводле медыйных упадабанняў: большасць, залежная ад жоўтай прэсы і тэлевізару, супрацьстаіць меншасці, залежнай ад інтэрнэту і электронных СМІ. Вельмі часта гэтым дзвюм частка́м няма пра што пагаварыць.

Безумоўна, праблема кічу — не выключна беларуская. Але ў іншых краінах насельніцтва, прынамсі, мае права выбару: у суседніх Расіі і Украіне поруч з гламурнымі поп-праектамі квітнее шоў-бізнес фестываляў рок-, этна-, джаз-, бард-, якой-толькі-захочаш музыкі. У Польшчы тэатралы збіраюцца на фэсты альтэрнатыўных ды вулічных тэатраў, у маленькай Літве штогод праходзіць некалькі буйных літаратурных фестываляў. Усё гэта — пры добрай рэкламе і вялікай глядацкай увазе. У Беларусі ж любыя спробы нефармальных мастакоў, артыстаў, музыкантаў займацца альтэрнатыўнай культурай вядуць чалавека ў глухое безнадзейнае гета культурнай альтэрнатывы. Невялікая тусоўка з невялікім, але адданым колам прыхільнікаў спрабуе ствараць супрацьвагу мейнстрыму. Як і любое мастацтва, гэта — без перспектывы зарабіць вялікія грошы і да канца рэалізавацца на радзіме.




## Альтэрнатыўныя «Детидетей»

Вось дэкарацыі, на фоне якіх акторка, вакалістка гурта «*Детидетей*» Ганна Хітрык выходзіць на мае падмосткі. З ёй поруч на сцэне граюць такія вядомыя вузкаму колу прыхільнікаў зоркі: Леанід Паўлёнак з «Нагуалю», Святлана Бень з «*Серебряной свадьбы*», Андрэй Такінданг з «Рэха» і «Гаротніцы», музыкі Атмараві, Сяргей Пукст, гурт «Джамбімбум» і некаторыя іншыя. Музыку яны граюць розную: іх аб'ядноўвае хутчэй тое, чаго яны не граюць: гэта не рок у класічным разуменні, прышчэпленым нам у 90-я, і гэта не папса. Трэці фармат.

Гурт «*Детидетей*» быў заснаваны ў 2005 годзе Ганнай і двума іншымі маладымі акцёрамі Купалаўскага тэатру. І амаль адразу адбылося неверагоднае: праект вельмі імкліва набраў папулярнасць, выпусціўшы за 4 гады 2 альбомы, даўшы безліч канцэртаў на вялікіх пляцоўках пры аншлагу. «Дзеткі» фактычна прарвалі блакаду культурнага гета па правым флангу (з левага флангу заходзіў гурт «*Серебряная свадьба*»). Пра альтэрнатыўную культуру загаварылі.

Ганна Хітрык пазітыўная. За гэта ёй хочацца падзякаваць у другую чаргу. Гэты пазітыў ідзе ад асобы і найбольш відавочны, калі Ганна выходзіць на сцэну як спявачка, а не як акторка. Як спявачка яна таксама грае ролю — вакалісткі альтэрнатыўнага гурта, галоўны месідж якога — дзяцінства засталося ў кожным з нас, колькі б нам ні было на пашпарце. Ганна-спявачка — сама сабе рэжысёр. Кожная песня — міні-мона-спектакль. Калі на тэатральнай сцэне яе стрымлівае тэкст, пастаноўка, вобраз, — то на музычнай яе не стрымлівае нічога. Яна стварае там такі вобраз, які хоча сама. У залю б'е фантан добрай энергіі і выдатнага настрою. «Гэта не каноплі, не!» — тлумачыць яна падарунак, прышчэплены да білета першага вясновага канцэрту гурта ў Мінску. На пакеціку напісана: «Першыя вясновыя парасткі». Прыходжу дадому, саджу — насустрач сонцу на маім падваконні прабіваецца душысты гарошак.

## Квіткі «на Хітрык»

Ганна Хітрык нарадзілася ў 1980 годзе ў Чэлябінску, узначаліла рускамоўны беларускі гурт і, здаецца, прынцыпова не размаўляе ў жыцці па-беларуску. Але самая важная для мяне рэч, за якую ёй хочацца падзякаваць, — яна патрыятычная. Ганна — патрыётка нашага з ёй гета, якая вядзе барацьбу за яго вызваленне. Ці не адзіная, хто адкрыта змагаецца супраць стразаў і блёстак, якія запаланілі беларускую культурную прастору. Падчас мінулагодняга канфлікту ў Купалаўскім тэатры, які прывёў да змены кіраўніцтва, Гаўрошам, што ўскочыў на барыкады і ад імя трупы адкрыта заявіў: у тэатры шмат анахранізму і папсы — была яна. Гэта быў яшчэ адзін важны прарыў альтэрнатыўнага мастацтва за межы, прызначаныя ёй СМІ і чыноўнікамі.

«Нармальных» спектакляў Купалаўскага тэатру даводзіцца чакаць больш за месяц, а на квіткі — паляваць. У большасці «нармальных» спектакляў занятая Хітрык. Даведацца, у які дзень грае які акторскі склад, фактычна немагчыма: ужо больш за год моладзь Мінску ходзіць у тэатр «на Хітрык», імкнучыся набыць квіткі менавіта на той, дзень, калі на сцэне будзе яна. Грае яна і на іншых тэатральных пляцоўках Мінску, але для мяне важна, што Хітрык-акторца належаць дзве шэдэўральныя інтэрпрэтацыі жаночых вобразаў з беларускай класікі — Ганна з «Сымона-музыкі» і Надзея з «Дзікага палявання караля Стаха».

У «Сымоне», пастаўленым Мікалаем Пінігіным, Ганна у выкананні Хітрык — з самага пачатку памяшаная; як і галоўны герой, яна абсалютна не ўпісваецца ў рацыянальны і груба-матэрыялістычны свет беларускай вёскі, яна адчувае скрыпку сэрцам, яна кахае Сымона, але там — на нябёсах. У спектаклі ёсць сцэна спаткання Ганы і Сымона над возерам. Ён і яна глядзяць перад сабой, не інтаніруюць рэплікі, не кранаюцца адзін аднаго. Але мы чуем не два маналогі, а дыялог закаханых людзей, бо закаханыя — не тыя, хто глядзяць адзін на аднаго, а тыя, хто глядзяць у адзін бок. А калі Ганна вар'яцее па-сапраўднаму, — мы бачым на сцэне не распусную русалку, як гэта атрымалася ў яе партнёркі па ролі, а хутчэй Афелію. Хітрык глядзіцца на сцэне як жаночая копія Сымонкі — Аляксандра Малчанава. Калі бачыш на сцэне гэтых двайнятаў, вобраз галоўнага героя ўрэшце раскрываецца напоўніцу, стаецца беларускім Інь-Янем.

Іншая справа — «Дзікае паляванне». Гэта фактычна тэатр адной актрысы. Надзея — жыхарка Балотных Ялінаў — таксама памяшаная. І сапраўды, дзяўчынка, якая перажыла столькі жаху, не можа быць нармальнай. Істэрычная торганасць, размовы з лялькай, лунатычны адсутны выгляд — і ў той жа час выхаванне, годнасць шляхцянкі — усё гэта арганічна спалучае сваёй ігрой Хітрык. У гэтым спектаклі ёй значна прайграюць усе мужчыны — і найперш Андрэй Беларэцкі — апантаны вечнымі сумневамі інтэлігент, паклікаы, паводле караткевіцкага сюжэту, ратаваць яе ад жаху.

Роля сястры ў «Старэйшым браце» паводле Вампілава на сцэне СХТ, роля жаўнера, які прачнуўся дзяўчынай у спектаклі «Матылёк» Тэатра юнага гледача... Акцёрскія інтэрпрэтацыі Хітрык — дзяўчаты, «не такія, як усе». А менавіта такія ў нас зазвычай трапляюць у культурніцкае гета.

Ганна Хітрык простая. Гэта рэч, за якую ёй хочацца падзякаваць напрыканцы, каб лепей запомнілася. Простая дзяўчына, якая ўсяго дасягнула, дзякуючы сваім унутраным якасцям, а не знешняй адпаведнасці нейкім шоу-фарматам. На яе месцы мог бы быць кожны з нас: усё залежыць ад імпэту, таленту, працаздольнасці, веры ў сябе — вось што адчуваеш, калі глядзіш на яе з тэатральнай залі, калі бачыш на фестывальнай пляцоўцы. Бач ты — нават акторы дзяржаўнага тэатру могуць выйсці на музычную сцэну — і не аблажацца. Дзяўчаты і хлопцы ў кедах і дрэдах, якія прыходзяць слухаць канцэрты «*Детидетей*», у захапленні: Ганна Хітрык прыгожая. Прыгожая той прыгажосцю, якая тоіцца ў кожным з нас і якую варта выпусціць на волю.

ПРАЕКТ

# ЦІ ЁСЦЬ ПРАВЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ПАЦЫЕНТАЎ

Юлія СНЕГ

**Нядаўна ў Мінску стартаваў праект «Развіццё правоў пацыентаў», ініцыяваны грамадскім аб’яднаннем «Цэнтр сацыяльных інавацый». І ўпершыню, каб абмеркаваць гэту тэму, за «круглым сталом» сабраліся прадстаўнікі сістэмы аховы здароўя, дактары, супрацоўнікі трэцяга сектару ў галіне абароны правоў чалавека. Удзельнікі дзеляцца сваімі развагамі ды ўражаннямі ад спробы знайсці шляхі вырашэння праблемы.**

## Закон мог бы быць лепшым

«У беларускім заканадаўстве ёсць шэраг дакументаў, якія рэгламентуюць правы пацыентаў Рэспублікі Беларусь, — распавядае юрыст грамадскага аб’яднання «Абарона правоў спажыўцоў» Кацярына Арлоўская. — Ёсць Закон аб ахове здароўя, які рэгулюе і тлумачыць пэўныя моманты, новая яго рэдакцыя ўвайшла ў дзеянне ў студзені. Ёсць Закон аб абароне правоў спажыўца, які таксама рэгулюе правы пацыентаў, але ён датычыць выключна тых, хто атрымлівае медычную дапамогу на платнай аснове, а не на бясплатнай. Новая рэдакцыя гэтага закона таксама дзейнічае са студзеня. Даволі неблагія законы, але яны — не поўныя, не цэльныя, адчуваецца раскіданасць інфармацыі».

Апроч таго, сябра праўлення Асацыяцыі хворых на рассеяны склероз «Беларускае таварыства інвалідаў» Алена Тамашэўская лічыць, што пацыенту не так лёгка разабрацца ў «раскіданых па розных дакументах правах і тэорыях, а напісанае ў законах, далёка не заўсёды адпавядае практыцы». «Правы юрыдычна існуюць у кожнага пацыента, — адзначае яна, — але, на жаль, дабіцца пацыент нічога не можа. Льготы інвалідаў скарацілі да мінімуму, гармоны толькі можна выпісаць. А шпіталізацыі ў доктара дамагчыся амаль немагчыма, і доктар таксама ні пры чым — куды ён будзе шпіталізаваць, калі папросту катастрафічна не хапае месцаў у шпіталях. А тым часам хвароба рассеяны склероз — цяжкая, страшная… Людзі пакутуюць на адзіноту. Не сакрэт, што 90 працэнтаў жанчын, якія захварэлі на рассеяны склероз, застаюцца з хваробай сам насам — мужы іх пакідаюць. Хаця большасць мужчын, што ў нашай асацыяцыі, — маюць сям’ю. Жонкі іх не кінулі. Атрымліваецца, што чалавек застаецца сам насам з хваробай, з адсутнасцю сродкаў, з цяжкай інваліднасцю, з як быццам бы прапісанымі нейкімі правамі на дапамогу ў заканадаўстве — і цалкам бездапаможным у сваёй бядзе».

## Правоў не ведаем, абавязкаў не шукаем

Калі праца над праектам пачыналася, высветлілася, што ніякіх адмысловых даследаванняў на тэму правоў пацыентаў не праводзілася. Таму «Цэнтр сацыяльных інавацый» правёў гэтую працу самастойна. Апыталі экспертаў з чатырох сектараў: чыноўнікаў Міндздрава, прадстаўнікоў трэцяга сектару, якія займаюцца абаронай правоў пацыентаў, грамадскіх арганізацый па абароне правоў медыкаў і юрыстаў-праваабаронцаў. Вынікі даследавання былі несуцяшальныя.

«Людзі, якія жывуць у Беларусі, калі нешта і ведаюць пра правы пацыентаў, то, хутчэй за ўсё, уяўляюць іх сабе вельмі няправільна, а гэта нараджае значна больш праблем, чым чагосьці станоўчага, — лічыць кандыдат сацыялагічных навук, аналітык Аксана Шэлест. — Нават самі эксперты вельмі лёгка блытаюць паняцце рэалізацыі правоў пацыентаў і абароны гэтых правоў. Калі мы спрабавалі разабрацца, дык як у нас усё ж працуе заканадаўства па абароне правоў пацыента, то ў якасці працоўных механізмаў у большасці сваёй эксперты называлі працу са скаргамі».

На думку доктара судова-медыцынскай экспертызы Андрэя Фаменкі, Беларусі варта ўзяць на ўзбраенне прагрэсіўны замежны досвед: «У еўрапейскіх краінах існуюць і асобныя законы аб правах пацыентах, існуюць асобныя законы, якія рэгламентуюць правы пэўных сацыяльных груп пацыентаў, існуе і развітая сістэма грамадскіх арганізацый, якія ўдзельнічаюць у рэгуляванні гэтых праблем».

Спробы стварыць адмысловы закон, прысвечаны правам пацыентаў, былі і ў Беларусі, распавёў старэйшы навуковы супрацоўнік лабараторыі асноў стандартызацыі норм забеспячэння аховы здароўя Таццяна Дудзіна: «У нашым цэнтры па даручэнні Міністэрства па ахове здароўя быў падрыхтаваны праект Закона па правах пацыентаў. Ён прайшоў ужо пэўную апрабацыю, быў агульны «круглы стол», як быццам усё абмеркавалі, усіх усё задаволіла, але далей за гэта не пайшло. Абмежаваліся тым, што ўсе правы цудоўна прапісаны ў дзейным заканадаўстве і не патрэбны асобны адзіны дакумент, з якім было б вельмі лёгка працаваць менавіта пацыентам».

«А пакуль што разабрацца ва ўласных правах пацыентам далёка не лёгка, — заўважыла юрыст Кацярына Арлоўская. — З усіх званкоў, якія паступаюць асабіста мне ў грамадскім аб’яднанні — прыкладна 70 працэнтаў звязаны з тым, калі я тлумачу, на што пацыент мае права, а на што — не мае. Гэтага людзі проста не ведаюць. Ці не разумеюць… Адсутнасць прававых ведаў — гэта, у прынцыпе, адна з самых вялікіх праблем у галіне абароны правоў пацыентаў наогул».

«Скаргі як масавы метад высвятлення адносін з беларускай медыцынай не выглядаюць канструктыўнымі, — лічыць Аксана Шэлест. — Праблема ў тым, што гэты прынцып працуе хутчэй як рэпрэсіўны ў дачыненні да медыцынскіх супрацоўнікаў, чым як механізм абароны права пацыента і тым больш яго рэалізацыі. У выніку, пацыенты незадаволены тым, што не рэалізуюцца іх правы, а медыкі — тым, што яны аказваюцца ў сітуацыі неабароненасці, бо скаргі разглядаюцца незразумела як, бо сама сістэма разгляду скаргаў у Міністэрстве аховы здароўя закрытая.

## Камунікацыі як спосаб узаемапаразумення

Ацэньваючы вынікі «круглага стала», Таццяна Дудзіна зазначыла, што плён сумеснай працы мог бы быць значна большым, калі б у Беларусі быў наладжаны кантакт паміж трэцім сектарам і ўладнымі структурамі. Замежны досвед супрацы недзяржаўных і дзяржаўных арганізацый працуе на карысць грамадства ў цэлым. У нас жа грамадскім арганізацыям нялёгка быць пачутымі ўладай. А правы пацыентаў — не ёсць самамэта. Гэта, па меркаванні Дудзінай, — паказнік эфектыўнасці працы сістэмы аховы здароўя. А менавіта жорсткай вертыкалі, нарматываў, заканадаўства. «У нашай краіне вельмі цяжка размаўляць пра правы, калі пагаварылі ды разбегліся. Калі ў нас будзе страхавая медыцына, абараняць будзе няма чаго. Правы будуць выконвацца. А цяпер мы ў нейкім такім падвешаным стане: як быццам усё добра, але самога паняцця, што ёсць правы, якімі можна карыстацца, пакуль няма», — лічыць Таццяна Дудзіна.

Летась на «гарачую лінію» Міністэрства аховы здароўя паступіла больш за 5 тысяч зваротаў ад грамадзян, незадаволеных якасцю аказання медычнай дапамогі. Пісьмовых скаргаў у Міндздраве атрымалі 5600. Атрымліваецца, штодня каля 40 грамадзян Беларусі скардзіцца на якасць медычнага абслугоўвання.


Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сяматычы
98,1 FM
БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ
www.racyja.com



АБ’ЯВА

MetalFront.org —
Metal/Gothic/Industrial Webzine прадстаўляе:

**АДКРЫЦЦЁ METAL-СЕЗОНУ!**

28 жніўня 17.00 клуб «Рэактар»

**Удзельнічаюць:**

**BESTIAL DEFORM** death metal (г. Санкт-Пецярбург)
Выступленне ў Мінску пасля шасцігадовага перапынку!

**ID:VISION** experimental metal (г. Мінск)
Прэзентацыя новага EP «X-ray Sun»!

**OUT OF YESTERYEAR** sympho/death metal (г. Мінск)
Прэзентацыя новай праграмы!

**IN SEARCH FOR** prog metal (г. Мінск)
Прэзентацыя дэбютнага альбому «Faith»!




**RIVERDALE** melodic death metal (г. Мінск)
Выступленне пасля трохгадовага перапынку! Прэзентацыя новага альбому «Time»!

**Квіткі:**
17 000 — першыя 100; 19 000 — папярэдне; 22 000 — у дзень канцэрту; 27 000 — месца за столікам

**Квіткі можна набыць:** пераход на плошчы Якуба Коласа; пераход каля ГУМа; пераход метро «Кастрычніцкая»; Iron Dream (Талбухіна, 4); ГЦ Купалаўскі, кропка № 19.

**Дадатковую інфармацыю можна атрымаць:**
www.metalfront.org; +37529 5646097; +37529 6490888; 296684300 (icq); admin@metalfront.org



Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
камунікат
www.kamunikat.org



Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 24.07.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.